In this regard, the author has studied the history of the collection and made a geographical index of I. Serbau's pictures according to the location of photographing. According to the author's annotations, the storage units were distributed by villages and uyezds. The photos were made in 74 villages in Pinsk, Igumen, Slutsk, Babruisk, Mazyr and Rechytsa uyezds, including the cities of Minsk, Pinsk, Pyetrykaw, and Rechytsa in Minsk province. One picture is from I. Serbau's native village — Kulshychy of Prapoisk uyezd in Mahilyow province (now in Slawharad district of Mahilyow region).

1 Tsishchanka, I.K. From the creative heritage of I. A. Serbau / I. K. Tsishchanka / / Pomniki historyi i kultury Belarusi (Monuments of History and Culture). — 1974. — No.1. — PP. 46-51; Tsishchanka, I. Inspired by Palessie (to the 125th anniversary of I.A. Serbau) / I.Tsishchanka / / Mastatstva. — 1996. — No.7. — PP. 65-73.

Certain villages were in turn localized according to the present state administrative division of Belarus. The geography of the photo collection covers a large area of today's Minsk region (Staryya Darohi, Slutsk, Barysaw, Uzda, Nesvizh, and Kapyl districts), Brest region (Pinsk, Stolin, Luninets, Ivatsevichy, Hantsavichy, and Lyakhavichy districts), Mahilyow region (Asipovichy and Slawharad districts), and Homiel region (Zhlobin, Svetlahorsk, Kalinkavichy, Mazyr, Pyetrykaw, Zhytkavichy, Rechytsa, Ragachow, and Khoiniki districts). The photographs reflect traditional culture of historical and geographical regions of Western and Eastern Palessie and the south-eastern part of Central Belarus.

Eight settlements of the former Pinsk uyezd from those that were visited by I. Serbau are part of the Ukraine: Vulka Rechytskaya, Zhalyaznitsa, Marochnaye, Nobel and Senchytsy of Zarichne district in Rivne region and Pazhog, Lyubashev, Byarena Volya of Lyubashev district in Volyn region. These materials are very important for the study of traditional ethnic culture of the modern Belarusian-Ukrainian frontier and Palessie region as a whole.

In 2010, the results of this work were presented by the author at the International Scientific Conference dedicated to the 450th anniversary of the Vilnius University, and were published in its Yearbook[2] . From now on, we began our collaboration with the Manuscript Department for further studies, processing and promotion of I. Serbau's photo collection — one of the most representative photo collections of the Library, which is of paramount importance for the history and culture of Belarus.

All documents in the collection, along with the author's annotations to photos and identification of the respective places where they were taken pursuant to the modern administrative-territorial division of Belarus have been introduced into the Library's electronic database by Valentina Karpova, an employee of the Manuscript Department[3]. Thus, in electronic documentation of the Library the authorship of Belarusian ethnographer I. Serbau was confirmed. This allowed the scientists and staff of Belarusian museums to use archive materials online via the Internet[4] .

To popularize I. Serbau's photographic heritage two photo exhibitions in Vilnius University and in the photographer's gallery of Lithuanian Arts at 4, Stiklyu Str. were organized in Vilnius in 2010. Part of the exhibited pictures was posted on the website of the Library. The exhibition had a wide resonance in the Lithuanian mass media; it was highlighted in the pages of many online resources[5] . The collection made interested the journal on anthropology that is published in the University of Edinburgh in the UK[6].

The unique photo collection by I. Serbau, history and the results of its study were presented to Belarusian readers in the article, *«Perhaps, I'm very keen on Palessie»*. On the ethnographic heritage of Isaac Serbau», in Polessie issue of «ARHE»[7] and in other Belarusian editions[8] .

---

2 Lobachevskaya, O. Photocollection by the Belarusian ethnographer Isaac Serbov in the Manuscript Department of Vilnius University: On the history of creation, attribution and dating / O. Lobachevskaya / / Vilniaus Universiteto Bibliotekos metrastis 2010. — Vilnius, 2010. — PP. 90-121.

3 Vilnius University Library/ Vilniaus Universiteto Bibliotekos [Electronic resource] — Mode of access: www.mb.vu.lt. — Date of access: 30.06.2012.

4 Lobachevskaya, O. Ethnographic photography as a source of museum representation of traditional culture: Vilnius photo collection of 1911-1912 by ethnographer Isaac Serbov / O. Lobachevskaya / / Museum and the traditional culture of Belarus: Materials of Intern. Scient. Pract.Conf., Homiel, May 17-18, 2011 / Editorial Board.: S.V. Ryazanov (ed.). [etc.] — Homiel, 2011. — PP. 12-13; Labacheuskaya, V. On the photographic heritage of I.A. Serbov: collections in Vilnius University Library and the National History Museum of the Republic of Belarus / O. Labacheuskaya, N. Savchanka / / Muzeyny Vesnik. No. 5 / incl. N.U. Kalymaga, A.I. Ladzisau, M.A. Plavinsky, Nat. Hist. Museum of the Republic of Belarus. — Minsk: Artiya Group, 2011. — PP. 71-77.

5 Labacheuskaya , V. Photoethnographic collection by Isaac Serbov of 1911-12 / V. Labacheuskaya / / Belarusian photographic web almanac [electronic resource]. — 11.05.2011. — Mode of access: http://www.photoscope.by/history/view/1770.html. — Date of access: 30.06.2012.

6 Isaak Serbov // The Unfamiliar an Antropological Journal. — 2012. — Vol. 1. — No. 2. — PP. 52-55.

7 Labacheuskaya, V. «Perhaps, I'm very keen on Palessie...» On ethnographic heritage of ethnographer Isaac Serbov / V. Labacheuskaya / / ARCHE. — 2011. — No.3. — PP. 28-51.

8 Labacheuskaya, V. Beauties a century ago/ V.Labacheuskaya, V. Lebedzeva / / Homielskaya Prauda. — 2012. — June 22. — P.5

Uniqueness and value of the Vilnius collection is particularly evident in comparing it with the collection of 149 photos by I. Serbau, which is kept at the National History Museum of Belarus in Minsk. Most photos of the Minsk collection do not have author's descriptive notes and the exact dates of photographing. Here, there are photos of the ethnographer's first travel in 1911, which he donated to the Minsk Church Archaeological Museum, and those already in the early Soviet years got in the Regional Museum and the Belarusian State Museum. This collection partially duplicates the photos of the Vilnius collection. Photos of a pottery from Haradnaya, farmers — vybrantsy from Luchniki and a countrywoman in a cart with oxen from the «Sakun's» village of Yuravichy, which belong to the National History Museum, have been repeatedly published in the Belarusian media. Comparison of the two collections allowed to make attributions of the most part of photo documents of the Minsk collection[9]. It turned out that in Minsk there are photos that are not represented in Vilnius, for example, the one made by I. Serbau in 1911 in his native village Kulshychy; a unique appearance of proshcha — a holy site in the village of Schytkavichy, the occurrence of which was described by the ethnographer in his work «The Belarusian Sakuns».[10] At the same time, the uniqueness and value of the Vilnius collection have been defined more clearly.

The history of how Serbau's photo collection appeared in Vilnius is associated with the activities of the Northwestern Branch of the Imperial Russian Geographical Society (IRGS), the member of which he had been since the restoration of the Society's activities in 1910. Due to financial assistance of the Branch in 1911–1913 the ethnographer made several trips to Belarusian Palessie, whose main aim was just photographing rapidly bygoing Belarus ethnographic antiquities. The photo albums made during these «photographic excursions» by I. Serbau together with his reports were given to the IRGS Northwestern Branch.

Documentary value and high-quality photos by I. Serbau were already highly appreciated by his contemporaries. In the foreword to the publication of I. Serbau's report on his trip to Palessie in the summer of 1911, the editorial of «Zapiski» (The Notes) of the IRGS Northwestern Branch noted the following: «This brief description is actually a report made by I.A. Serbau. Necessary complements to it are made by him photographs of villages, their inhabitants, peasant subjects, goods and others. The author sent to the Branch a collection of his photographs (9 x 6 cm). We hope to publish this ethnographic album in due course. It is our duty to bring I.A. our gratitude for the precious gift».[11] Unfortunately, these plans were never realized. They were prevented by the First World War. Subsequent historical events for almost half a century made a photo collection of the Belarusian ethnographer that was hidden in Vilnius virtually unattainable for the Belarusians.

Album «The Belarusians in the photos by Isaac Serbau of 1911–1912» for the first time in full returns I. Serbau's photoethnographic heritage to Belarus. This anniversary edition celebrates 100 years that have passed since the time when the ethnographer travelled throughout Belarus. A century later the project that has not lost its social and scientific significance has been realized. Its

9 Labacheuskaya, V. On the photographic heritage of I.A. Serbov: collections in Vilnius University Library and the National History Museum of the Republic of Belarus / O. Labacheuskaya, N. Savchanka / / Muzeyny Vesnik. No. 5 / incl. N.U. Kalymaga, A.I. Ladzisau, M.A. Plavinsky, Nat. Hist. Museum of the Republic of Belarus. — Minsk: Artiya Group, 2011. — PP. 71–77.

10 Serbau,I. The Belarusian Sakuns / I. Serbov / Foreword, translation and preparation for printing by A. Valakhnovich / / Polymya. — 2011. — No.8. — P.45.

11 Serbov I. A. Through the Dregovichs' area in the summer of 1911. I.A.Serbov / / Notes of the Northwesern Branch of the Imperial Russian Geographical Society. B. 3 — Vilna, 1912. — P. 304.

realization has become possible thanks to the sincere interest of «The Petrus Brovka Belarusian Encyclopedia Publishing House» in the publication of the album.

The structure of the album consists of the points of the route, which I. Serbau passed in 1912. It is this travel, long and large for covering the area, that left the greatest number of photos. The illustrations are supplemented with excerpts from published and unpublished works of the ethnographer, which provide a successful response to what he recorded using a camera; his observations, reflections, interesting stories that happened with the researcher during the travel and daunting at the time photographic work are given.

The album contains 442 photos and is a complete catalogue of I. Serbau's collection owned by the Manuscript Department of the Vilnius University Library. In the captions to photos and quotes from I. Serbau's papers, the place names have retained the author's original spelling. The captions in square brackets are from the author of the album. In conventional brackets there is the current name and location of the settlement, where the photo was made, according to the current administrative division of Belarus. For ease of application, geographical indication of settlements is placed. Some historical and ethnographic features that can be seen in the photographs are explained in the author's comments that are given at the end of the album.

Volga Labacheuskaya
Candidate of Art (Ph.D)

«Вандраваў з кодакам і запісной кніжкай па палях і вёсках...»

Фотаэтнаграфічная спадчына І.А. Сербава

Этнограф Ісак Абрамавіч Сербаў пакінуў нам яскравую фатаграфічную спадчыну. Захавалася каля 600 яго арыгінальных фотаздымкаў. 80 фатаграфій апублікаваны ў яго этнаграфічных працах «Беларусы-сакуны»[1] і «Вячанскія палявіне»[2]. Мінула сто год з таго часу, як даследчык вандраваў па Беларусі ўзброены выдатным вынаходніцтвам свайго часу — пераносным фотаапаратам «Кодак». Фотаздымкі, выкананыя І. Сербавым, — неацэнны скарб ведаў аб беларусах, якімі яны былі 100 гадоў таму назад, каштоўнейшыя візуальныя дакументы па этнаграфіі і антрапалогіі Беларусі, асабліваціх народнай архітэктуры, лакальных традыцыйных строяў і побыту. Разглядаючы сёння выявы беларускай мінуўшчыны, якія дзякуючы цуду фатаграфічнай тэхнікі і асаблівому ўласнаму погляду на рэчаіснасць, даследчык здолеў увасобіць на сваіх фотаздымках у пачатку XX ст., мы можам па праву назваць І. Сербава адным з першых беларускіх візуальных антраполагаў.

* * *

Рубеж XIX–XX стст. ў асвятленні этнографаў быў часам захапленння фатаграфіяй. Калі ў другой палове XIX ст. фотаздымкі народных тыпаў выконваліся пераважна на ўмовах фотаатэлье, то ў пачатку XX ст. фатаграфаванне робіцца неад'емнай часткай прафесіі і паляўнічай працы этнографаў. Асаблівую ўвагу фотадакументацыі этнаграфіі народаў Расійскай імперыі надавала Імператарскае Рускае геаграфічнае таварыства і этнаграфічны аддзел Рускага музея ў Санкт-Пецярбургу. Этнографы-вандроўнікі, асвоіўшыя пераносную фотаграфічную тэхніку, якая была вынайдзена да таго часу, і з цяжкой ношаю крохкіх шклянных пласцінак для негатываў, выпраўляліся ў далёкія краіны Азіі, Усходу, Каўказа, аддаленыя куткі еўрапейскай Расіі. Дзякуючы гэтым падзвіжнікам, далёкае і неспазнанае станавілася тады блізкім і відавочным для шырокага кола людзей. У той перыяд былі створаны і першыя калекцыі этнаграфічных фотаздымкаў у Беларусі.

Фотадакументацыю беларускай этнаграфіі распачаў у 1905 г. студэнт Санкт-Пецярбургскага універсітэта В. Костка, які па заданню этнаграфічнага аддзела Рускага музея зрабіў фотаздымкі у Слуцкім і Ігуменскім паветах Мінскай губерні. Захавалася каля 200 яго фотанегатываў. У 1906–1910 гг. серыю этнаграфічных фотаздымкаў у Слуцкім, Мазырскім Мінскай і Гомельскім, Быхаўскім паветах Магілёўскай губерняў выканаў А. Сержпутоўскі[3]. Наступны у 1911–1913 гг. з'явілася фотаколекцыя І. Сербава.

---

1. Сербов, И.А. Белорусы — сакуны / И.А. Сербов // СБ. отделения рус. языка и словесности Импер. Акад. наук. — Петроград, 1915. — Т. XCIV, № 1. — С. 1–49. Яго ж. Вячанскія палявіне: матэрыяльная культура: этнаграфічны нарыс Беларускага Палесся / І.А. Сербаў ; прадм. Т.А. Новагародскага, В.А. Пяскуна. Мінск: БФК, 2005. — 88 с.
2. Калекцыя фотаздымкаў захоўваецца ў фотатэцы Расійскага этнаграфічнага музея ў Санкт-Пецярбургу.

Фотаздымкі І. Сербава займаюць асаблівае месца ў гісторыі беларускай фатаграфіі. Этнографа па праву можна назваць у гэтай галіне першапраходцам краіны Палесся. Да яго на Палессі пераважна рабілі студыйныя фотаздымкі. У 1867 г. для экспанавання на Усерасійскай этнаграфічнай выстаўкі былі выкананы ва ўмовах атэлье фотапартрэты сялян Гродзенскай губерні, у 1903 г. па заказе этнографаў А. і В. Харузіных — здымкі палескіх жанчын з Кобрынскага павета ў намітках.

І. Сербаву — навукоўцу выпаў унікальны і шчаслівы шанец вандраваць па Беларусі, і пры тым, узброеным фотатэхнікай. Тыя тры гады яго вандровак напярэдадні Першай сусветнай вайны былі бадай апошнімі ў гісторыі існавання амаль некранутай на той час цэласнасці традыцыйнай культуры і светапогляду жыхароў унікальнага рэгіёну — Палесся. Яго фотаздымкі не маюць сябе роўных у дакументацыі Палесся па ахопу тэрыторыі, дасканаласці этнаграфічнага падыходу, паслядоўнасці рэалізацыі серыйнага прынцыпу іх выканання. На іх зафіксаваны той архаічны патрыярхальны свет, які пасля яго на Палессі будуць шукаць ўсе даследчыкі этнакультуры гэтага ўнікальнага рэгіёну на карце Еўропы.

* * *

Ісак Абрамавіч Сербаў нарадзіўся 25 мая 1871 г. ў в. Кульшчычы Прапойскага павета (цяпер Слаўгарадскі раён Магілёўскай вобласці) у сям'і малазямельнага селяніна-беларуса. У 1892 г. ён скончыў Полацкую настаўніцкую семінарыю, у 1901 г. — Маскоўскі археалагічны інстытут, пасля чаго працаваў настаўнікам ў Мінску, Вільні, Гомелі і ў сельскіх школах[3]. Этнаграфія, археалогія, фальклор беларусаў былі яго захапленням. У час працы настаўнікам ён пачаў збіраць фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы. З 1908 г. І. Сербаў стаў членам Мінскага царкоўнага гістарычна-археалагічнага камітэта і разам з А.К.Сніткам, А. Пановым стварыў Мінскі царкоўна-археалагічны музей. Па заданні і на сродкі камітэта зімой 1911 г. ён здзейсніў сваю першую вандроўку па Мінскай губерні з мэтай «збору этнаграфічных калекцый»[4] (мал. 1). З таго часу захаваліся яго зімовыя фотаздымкі з Даманавіч, Жыціна, Крынкі, роднай вёскі Кульшычы. З узнаўленнем у Вільні ў 1910 г. дзейнасці Паўночна-Заходняга аддзела Імператарскага Расійскага геаграфічнага таварыства І. Сербаў прымае актыўны ўдзел у працы яго археалагічна-этнаграфічнай секцыі.

Паўночна-Заходні аддзел ІРГТ надаваў вялікае значэнне вывучэнню гісторыі, этнаграфіі, археалогіі, прыродазнаўчым навукам, статыстыцы Паўночна-Заходняга краю, як называлі ў той час Беларусь і Літву. Сярод метадаў даследавання і збору інфармацыі не былі пакінуты па-за ўвагай навейшыя магчымасці збірання этнаграфічнай дакументацыі спосабам фотафіксацыі народных тыпаў і артэфактаў сялянскага побыту, традыцыйных заняткаў, архітэктуры і народных строяў, якія імкліва адыходзілі ў нябыт. Не выпадкова ў 1911 г. на пасяджэнні Адзела была зацверджана «Інструкцыя для асоб, якія жадаюць займацца фатаграфаваннем у навуковых мэтах (этнаграфія і антрапалогія)», у распрацоўцы якой прымалі Д.І. Даўгяла і А.Ф. Зянкевіч, і была створана спецыяльная падкамісія, якая павінна была абмеркаваць, якім чынам пры садзейнічанні народных настаўнікаў сабраць фатаграфічныя калекцыі ў адпаведнасці з распрацаванай этнаграфічнай секцыяй праграмай[5].

Настаўнік 2-га Мінскага гарадскога вучылішча І. Сербаў быў першым, хто прапанаваў Паўночна-Заходняму аддзелу свой праект этнаграфічнай экскурсіі з мэтай фатаграфавання. У сакавіку 1911 г. на сваім сходзе члены аддзела з прадстаўленых на іх разгляд трох этнаграфічных і археалагічнай заявак падтрымалі толькі прашэнне І. Сербава. У пратаколе пасяджэння было запісана наступнае: «Прызнаць фатаграфічную экскурсію як найбольш адпавядаючай стану касы Паў. Зах. Аддзела і яго запатрабаванням, для гэтага адпусціць са сродкаў Аддзела 60 руб. у распараджэнне настаўніка 2-га гарадскога вучылішча І. А. Сербава, які мае намер выправіцца ў найбольш цікавыя ў этнаграфічных адносінах мясцовасці Мінскай губерні»[6].

3 Беларусы: У 8 т. Т. 3: Гісторыя этналагічнага вывучэння / В.К. Бандарчык; рэдкал.: В.К. Бандарчык і інш. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; — Мінск.: Беларуская навука, 1999. С. 229.

4 Пасведчанне І.А. Сербаву канцыляры Мінскага генерал-губернатара за № 875 ад 16 лютага 1911 г. VBU RS, F 34, b. 701, l. 50.

5 Журнал ПЗА ІРГТ № 9 ад 26 сакавіка 1911 года. Гл. VBU RS, F 34, b. 700, l. 29-30, 32.

6 Тамсама. Арк. 32.

І. Сербава цягнула Палессе. У сваёй справаздачы аб паездцы 1913 г. І. Сербаў напісаў: «Самае Палессе — краіна багатая і вельмі мала даследаваная. Тут на кожным кроку можна сустрэць прадметы, якія наўрад ці добра вядомы навуцы [...]. Мабыць я вельмі захапляюся Палессем, але мне вельмі б хацелася проста-такі паказаць нашым вучоным спецыялістам, што для іх працы па геалогіі і прыродазнаўству, археалогіі і гісторыі, этнаграфіі і дыялекталогіі адчыняецца шырокае поле не дзе-небудзь далёка ў экзатычных краінах, а тут ў нас дома на прывольным Палессі»[7]. Палессе для яго ўяўлялася вялізарным абшарам рассялення нашчадкаў старажытнага племені дрыгавічоў, які, па перакананні даследчыка, ахопліваў значную тэрыторыю сучаснай Беларусі ад вытокаў Нёмана і Заходняга Буга, да Дняпра і яго прытокаў — Бярэзіны і Прыпяці, а таксама прылеглыя часткі сучасных Валынскай і Ровенскай абласцей Украіны. У сваіх поглядах этнограф абапіраўся на тэорыю паходжання беларускай народнасці расійскага гісторыка А.А. Шахматава і іншых вучоных, якія выводзілі этнагенез беларусаў непасрэдна ад старажытных усходнеславянскіх народаў[8].

І. Сербаў невыпадкова імкнуўся даследаваць «краіну дрыгавічоў ці палешукоў». Ён лічыў, што «з усіх беларускіх плямёнаў менавіта дрыгавічы, гэтыя насельнікі глухіх лясоў і гразкіх балот, да цяперашняга часу захавалі больш поўна нацыянальныя старажытнарускія рысы не толькі ў побыце, але таксама ў сваім выглядзе і характары»[9].

Першая вандроўка этнографа па заданні Паўночна-Заходняга аддзела ІРГТ адбылася ў вольныя ад настаўніцкай працы летнія месяцы 1911 г. ў Ігуменскі, Бабруйскі паветы Мінскай губерні, Магілёўскі і Чавускі паветы Магілёўскай губерні[10]. Яна мела азнаямленчы характар, разам з тым у навуковым плане была вельмі плённая. Этнограф кіраваўся этнаграфічнай праграмай Паўночна-Заходняга аддзела ІРГТ. У справаздачы «По Дреговичской области летом 1911 года» І. Сербаў дакладна адказвае на ўсе пункты праграмы і дае агульную характарыстыку тэрыторыі рассялення, антрапалагічным асаблівасцям, адзенню, паселішчам, забудовам, начынню, транспартным сродкам, гаспадарчым заняткам, промыслам і рамёствам, некаторым асаблівасцям абрадаў дрыгавічоў. Невыпадкова ў наступныя паездкі, якія былі таксама патрыманы Паўночна-Заходнім аддзелам ІРГТ, ён накіраваўся менавіта ў тыя раёны Палесся, дзе «да таго часу захавалася этнаграфічная паласа дрыгавіцкай культуры»[11].

Значныя вынікі дала яго «этнаграфічна-фатаграфічная экскурсія» 1912 г. Шляхі этнографа пралягалі па Бабруйскім, Ігуменскім, Мазырскім і Слуцкім паветах Мінскай губерні. Вандроўка доўжылася з 8 чэрвеня па 12 жніўня (па ст. стылі)[12]. Ён праехаў каля 1800 вёрст, з іх больш за 1000 — на падводзе, каля 800 — па чыгунцы і на аўтамабілі, плыў па рэках Стыр, Ясельда, Прыпяць на параходзе. З борта парахода зроблены ім фотаздымкі — панарамы Пінска, Хойна, Турава. У пачатку сваёй вандроўкі І. Сербаў спрабаваў перасоўвацца паміж вёскамі на веласіпедзе, які захапіў з Мінска. Але хутка выявілася недарэчнасць такога спосабу этнаграфічнай вандроўкі, бо від транспарту, па словах даследчыка, «ў вачах народа пазбаўляў паездку ўсялякага сур'ёзнага сэнсу, бо веласіпед у вёсках пакуль яшчэ з'яўляецца прадметам пустой цікавасці і грубых жартаў»[13]. У выніку веласіпед быў адпраўлены цягніком назад у Мінск. Прытулак этнограф-вандроўнік атрымліваў у мясцовых святароў, настаўнікаў, валасных пісараў, у дамах яўрэяў-местачкоўцаў, прыпыняўся на начлег па заездных дамах, у памяшканнях сельскіх пачатковых вучылішч, якія пуставалі ў летні час.

Фотаздымкі, зробленыя ў час паездкі 1912 г., І. Сербаў прадставіў віленскай грамадскасці на выстаўцы, якая была наладжана 23 сакавіка 1913 г. ў памяшканні актавай залы Віленскай мужчынскай гімназіі ў час правядзення гадавога сходу членаў Паўночна-Заходняга аддзелу ІРГТ[14].

---

7 Справаздача аб паездцы І.А. Сербава на Пінскае Палессе летам 1913 г. Гл. VBU RS, F 34, b. 659, l.13.

8 Беларусы: У 8 т. Т. 3: Гісторыя этналагічнага вывучэння С. 220.

9 Сербов И.А. По Дреговичской области летом 1911 г. И.А. Сербов // Записки Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества. Кн. 3. — Вильна, 1912. — С. 304.

10 Справаздача ПЗА ІРГТ за 1911 г. Гл. VBU RS, F 34, b. 704, l. 10. Дакладны маршрут і тэрміны, вандроўкі нам высветліць не ўдалося.

11 Сербов И.А. По Дреговичской области летом 1911 г. С. 320.

12 Сербов, И.А. Поездка по Полесью летом 1912 г. / И.А. Сербов // Записки Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества. Кн. 4. — Вильна, 1914. — С. 70.

13 Тамсама. С. 71.

14 Пратакол гадавога сходу ПЗА ІРГТ ад 29 марта 1913 г. Гл. VBU RS, F 34, b. 711, l. 21.

У 1913 г. І. Сербаў зноў звярнуўся з хадайніцтвам у Паўночна-Заходні аддзел ІРГТ і атрымаў грашовую субсідыю на наступную вандроўку[15] (мал. 2). Летам гэтага года ён аб'ехаў паўночную частку Пінскага Палесся, у склад якога ўваходзілі ўся паўночная частка Пінскага і паўночна-заходняя частка Мазырскага паветаў Мінскай губерні, а таксама ўсходнія часткі Слонімскага, Пружанскага і Кобрынскага паветаў Гродзенскай губерні. Матэрыял збіраўся ў паселішчах, размешчаных у басейнах левабярэжных прытокаў Прыпяці — рэк Цна, Бобрык і Ясельда. Галоўнымі пунктамі яго даследаванняў былі: ў Пінскім павеце вёскі і мястэчкі Дзятлавічы, Вічын, Кажан-Гарадок, Лунінец, Дубнавічы, Пагост, Новы Двор, Лагішын, Азарычы, Целяханы, Святая Воля, Аброва, Бродніца, Ляхавічы; у Кобрынскім — Іванава, Дружылавічы, Моталь, Бездзеж, Хомск; у Пружанскім — Бяроза Картуская, Ревяцічы[16]. У 1913 г. этнограф атрымаў падтрымку таксама ад Аддзела рускай мовы і славеснасці Імператарскай Акадэміі навук, у выніку чаго ім былі сабраны матэрыялы да этнаграфічнага нарыса «Беларусы сакуны», выдадзенага ў 1915 г.[17].

Адной з галоўных задач палескіх вандровак І. Сербава было фатаграфаванне, «састаўленне этнаграфічнай калекцыі фатаграфічных здымкаў»[18]. Што даследчык імкнуўся уратаваць на іх ад няўмольнага часу?

Яго вандроўкі адбываліся ў той час, калі патрыярхальнасць Палесся была яшчэ не кранутая выбухам Першай сусветнай вайны. Разам з тым, цывілізацыйныя змены пачатку XX ст. не абміналі Палесся. Менавіта ў гэтым патрыярхальным краі яны былі асабліва на відавоку. Дзякуючы этнаграфічным апісанням сярэдзіны і другой паловы XIX ст, Палессе ўспрымалася архаічнай краінай, дзе захавалася шмат старажытнасцяў. У пачатку XX ст. стэрэатып архаічнага Палесся трывала валодаў свядомасцю вучоных і грамадства. Не пазбаўлены яго быў і І. Сербаў. Але ўжо яго першае сутыкненне з этнаграфічнай рэчаіснасцю Палесся ў 1911 г. выявіла канфлікт паміж даследчыцкімі спадзяваннямі і мясцовай рэальнасцю, якая тут хутка змянялася. У заключэнні сваёй справаздачы па паездцы 1911 г. ён адзначае, што традыцыйная культура даследаванай ім тэрыторыі губляе свае індывідуальныя рысы, асабліва паблізу культурных цэнтраў і чыгункі, дзе «першабытнае жыццё прыняло зусім іншы характар».

У адрозненні ад сваіх папярэднікаў — вандроўнікаў па Палессі XIX ст., якія былі ўзброены толькі ўважлівымі вачамі, добрай памяццю, жывой цікавасцю да невядомай ім краіны і жыцця яе людзей, ды адзінай магчымасцю фіксаваць свае назіранні — весці падрабязныя падарожныя нататкі ў дзённіках, І. Сербаў, як даследчык, меў магчымасць і тэхнічныя сродкі для наглядна-дакументацыі ўбачанага. Фотаапарат «Кодак», з якім ён падарожнічаў, дазваляў зафіксаваць рэчаіснасць у наяўных візуальных вобразах.

Аб стаўленні І. Сербава да фатаграфавання, яго падыходах да натуры, метадах, якімі ён карыстаўся, можна даведацца з яго справаздачы па паездцы па Палессі 1912 г., у якой ён неаднаразова згадвае пра тое, што ў дзень «вандраваў з кодакам», «кодакам і запісной кніжкай» па палях і вёсках, або ездзіў «на веласіпедзе з кодаком», і адзначае, якія менавіта фотаздымкі зрабіў у тым ці іншым населеным пункце. Увечары, калі не было светлавых ўмоў для фатаграфавання, этнограф слухаў і запісваў з голасу выканаўцаў мясцовыя песні, казкі, паданні.

Сваіх герояў І. Сербаву прыходзілася настойліва ўгаворваць пазіраваць перад фотаапаратам. Для палешукоў фотаапарат быў рэччу, якую напэўна яны бачылі першы раз у жыцці, таму ў разгубленасці яны не ведалі, як ставіцца да прапаноў этнографа пазіраваць для фотаздымкаў. Пры гэтым, як ён адзначае, моладзь ставілася да фатаграфавання нават больш падазрона, чым старыя.

Чалавек з фатаграфічным апаратам выклікаў недавер не толькі ў сялян. Вельмі насцярожана ўспрымалі І. Сербава і прадстаўнікі мясцовых улад — пісары, паліцэйскія. Так, у мястэчку Петрыкаў, куды этнограф выправіўся на Ільінскі кірмаш, з ім здарыўся прыкры выпадак, які ён падрабязна апісаў у сваёй справаздачы: «Мне хацелася зняць гэты палескі кірмаш ва ўсіх відах, але паліцыя перашкодзіла. У самы разгар працы ўраднік арыштаваў мяне з фатаграфічным

15 Прашэнне ў ПЗА ІРГТ І. Сербава ад 14 сакавіка 1912 г. Гл. VBU RS, F 34, b. 712, l. 33, 34.
16 Справаздача І.А. Сербава на Пінскае Палессе летам 1913 г. Арк. 12.
17 Сербов, И.А. Белорусы-сакуны. С. 1-49.
18 Сербов И. А. По Дреговичской области летом 1911 г. С. 304.

апаратам і пад канвоем адправіў мяне да прыстава. Хочаш не хочаш прыйшлося прыпыніць працу і са ўсімі прыладамі шагаць па сыпучым пяскам вярсты 2 ½ за мястэчка. Прыстаў хутка адпусціў мяне і дазволіў працягваць працу. Але ўсё ж зручны час для маментальнага фатаграфавання прайшоў, а сам настрой знік. Таму кірмашовыя сцэны атрымаліся не ва ўсім іх аб'ёме і разнастайнасці»[19]. Ільінскі кірмаш быў славуты тым, што на яго палешукі прыганялі на продаж сваіх валоў, цыганы прыводзілі коней, яўрэі гандлявалі «красным таварам». На здымках, які здолеў усё ж зрабіць І. Сербаў, можна бачыць жывыя сцены кірмашовай паўсядзённасці, стракатасць этнічных тыпаў — мясцовых беларусаў у адметных строях, яўрэяў, цыганоў. Адна з удач фатографа — здымак сляпога музыкі Сцяпана Гальца з лірай і яго спадарожнікаў каля царквы.

У в. Грыцэвічы (цяпер у Клецкім раёне) этнограф патрапіў у непрыемнае становішча, якое апісаў наступным чынам: «Валасны пісар п. Ганчарэнка прыняў мяне за нейкага вельмі небяспечнага выведніка, учыніў нада мной сур'ёзны допыт, і агледзеў усе мае паперы і дакументы. У рэшце, не задаволены гэтым, аб'явіў, што ён паслаў нарачнага ў м. Ганцавічы да земскага начальніка, каб той неадкладна з'явіўся на месца здарэння. Ад бяды пазбавіў мяне мясцовы святар о. Герасімовіч, які супакоіў пісара і прыняў мяне пад сваю апеку»[20]. У гэтай вёсцы І. Сербаў прабыў некалькі дзён, сфатаграфаваў мясцовыя тыповае адзенне і пабудовы, і працягнуў далей сваё падарожжа.

Выходзіць з непрадбачаных сітуацый этнографу дапамагалі пасведчанні ад канцылярыі мінскага губернатара, у якіх было зазначана, што ён выконвае «важнае навуковае даручэнне» і прапанавалася земскім начальнікам і начальнікам паліцыі аказваць яму садзейнічанне (мал. 1)[21].

У 1911 г. сабраным І. Сербавым фотаэтнаграфічным матэрыялам была нанесена значная шкода ў выніку дзеянняў прадстаўнікоў адміністрацыі. У Смаленску на чыгуначнай станцыі ён быў затрыманы мясцовым кандуктарам і жандармам станцыі, якія прымусілі яго здаць багаж з шклянымі пласцінкамі і фотаапаратам у багажны вагон. Калі І. Сербаў атрымаў яго назад на станцыі Орша, апарат быў зламаны, адфатаграфаваны матэрыял беззваротна згублены — замест соцен негатываў у раструшчаным кошыку ляжаў шкляны друз[22]. У справаздачы па экспедыцыі І. Сербаў ацаніў нанесеную яму матэрыяльную шкоду ў 260 руб. і ў сувязі з тым, што «страціў магчымасць прадставіць у Паўночна-Заходні аддзел дастатковую этнаграфічную калекцыю фатаграфічных здымкаў у 1911 г.», ён звярнуў атрыманы раней на паездку аванс ў памеры 60 руб. Разам з тым, аддзел, паставіўшыся з асаблівай ўвагай да «самаадданай паездкі» І. Сербава, вырашыў вярнуць яму азначаную суму, каб пакрыць хоць бы невялікую частку яго вялікіх выдаткаў[23]. Выпадак з даследчыкам меў значны грамадскі рэзананс у Вільні[24]. На агульным сходзе Паўночна-Заходняга аддзела ў лютым 1912 г. было вырашана ўзнагародзіць настаўніка І. Сербава, які пацярпеў пад час этнаграфічнай экскурсіі ў 1911 г., і вылучыў яму для пакрыцця выдаткаў матэрыяльную дапамогу ў памеры 75 рублёў[25]. Можна меркаваць, што на атрыманыя сродкі І. Сербаў набыў новы фотаапарат, з якім у 1912 г. зноў выправіўся ў чарговую паездку па Палессі.

Фотаздымкі і запісы І. Сербава сведчаць, што ў тыя гады да фатаграфавання ён ставіўся, як да вельмі важнай, бадай галоўнай, складаючай часткі сваёй этнаграфічнай працы. Вучоны добра разумеў, што мае дачыненне да натуры, якая знікае. Фотаапарат дазваляў захаваць для нашчадкаў антрапалагічнае аблічча тагачасных тутэйшых людзей, іх строі, асаблівасці вясковай забудовы, традыцыйныя сялянскія заняткі. У выніку самахвярнай палявой працы і дасягнення шырока акрэсленых задач даследчык здолеў стварыць ілюстраваную энцыклапедыю па этнаграфіі Беларусі і беларусаў.

19 Сербов И.А. Поездка по Полесью летом 1912 г. С. 100.

20 Тамсама. С 79.

21 Пасведчанне І.А. Сербаву канцылярыя Мінскага генерал-губернатара за № 875 ад 16 юітага 1911 г. Гл. VBU RS, F 34, b. 701, l. 50; Ліст у ПЗА ІРГТ Мінскага губернатара ад 29 сакавіка 1913 г. за № 1422. Гл. VBU RS, F 34, b. 712, l. 42.

22 Цішчанка, І. Акрылены Палессем (125 гадоў з дня нараджэння І.А. Сербава) / І. Цішчанка // Мастацтва. — 1996. — № 7. — С. 51; Справаздача ПЗА ІРГТ за 1911 г. Гл. VBU RS, F 34, b. 704, l. 11.

23 Справаздача ПЗА ІРГТ за 1911 г. Гл. VBU RS, F 34, b. 704, l. 12.

24 Аб гэтым выпадку 21 лютага 1912 г. напісала газета «Северо-Западная жизнь» (№ 42, с. 4).

25 Журнал ПЗА ІРГТ № 14, 3 чэрвеня 1912 г. Гл. VBU RS, F 34, b. 705, l. 5.

На здымках І. Сербава мы бачым жыхароў беларускіх паселішчаў: гарадоў, мястэчак, вёсак, аколіц і хутароў; прадстаўнікоў розных саслоўяў: сялян, шляхту, мяшчан, працоўную інтэлігенцыю, а таксама выявы суседзяў беларусаў — яўрэяў, цыган, для якіх Беларусь з часоў сярэднявякоўя стала радзімай. Этнограф-фатограф зафіксаваў вясковыя вуліцы паселішчаў і іх жыхароў у святочныя дні (Дражна, Крынкі, Любяшоў, Вялікія Аўцюкі, Прудок, Язвін, Гарадная, Тырвовічы, Гарадная), двары сялян з прыладамі сельскагаспадарчай працы (Якімава Слабада, Марочна, Жыцін), гумны, хлявы, адмыслова складзеныя стагі збажыны, азяроды — прыставанні для сушкі сена (Вуйвічы, Даманавічы, Вялікія Аўцюкі, Лучнікі, Раздзялавічы, Хатынічы), драўляныя ветракі (Вуйвічы, Якімава Слабада) і цэрквы характэрных архітэктурных форм у вёсках і мястэчках Палесся (Плотніца, Лемяшевічы, Крынкі, Хатынічы, Тураў, Сенчыцы, Барыскавічы, Турэц, Хойнікі, Прудок, Горваль, Гарадная, Вуйвічы, Васілевічы, Радчыцк), могілкі з высокімі палескімі крыжамі і старажытны звычай класці на магілы дубовыя калоды-прыклады (Хойнікі, Вуйвічы, Рэчыца). І. Сербаў фатаграфуе разнастайныя моманты сялянскай штодзённасці: жанчыны, якія жнуць (Рудня, Любяшаў), бяруць каноплі (Жыцін) ці лён (Юравічы), сядзяць з кудзеляй пры калаўротку (Лучнікі, Красны Бераг), шкрабаюць бульбу (Васілевічы); мужчыны аруць на валах (Юравічы), косяць і кладуць стагі сена (Парычы, Марочна, Рудня, Вялікія Аўцюкі, Шупейкі), дзеткі-пастушкі даглядаюць статак авечак (Вялікія Аўцюкі).

Этнографа цікавілі рамесныя, прамысловыя заняткі сялян і формы гандлю. І. Сербаву належыць знакамітая серыя фотаздымкаў, на якіх падрабязна зафіксаваны працэс ганчарства ў Гарадной (Столінскі раён) ад нарыхтоўкі гліны да вырабу посуду розных форм і мясцовай вытворчасці цэглы. Удалося яму нават ухапіць напружанасць псіхалагічных адносін паміж ганчаром і мясцовымі перакупшчыкам-яўрэям. Вельмі цікавы здымак, на якім можна ўбачыць, як адбываўся гандаль гараднянскім посудам узімку ў в. Даманавічы. У в. Жыцін ён сфатаграфаваў вандроўнага гандляра — «каравашніка» з мястэчка Шацк. На кірмашах у палескіх мястэчках (Дражын, Петрыкаў, Вялікія Аўцюкі) этнограф здымаў разнастайныя персанажы: мясцовы сялянскі люд, сляпцоў-музыкаў, жабракоў, цыганоў, яўрэяў-гандляроў. Адлюстраваны на яго фотаздымках рамесныя заняткі па вырабу колаў (Заходы, Куршынавічы), бортнік з прыладамі свайго старажытнага промыслу (Крынкі, Птушычы). У фотааб'ектыў І. Сербава трапляла таксама палеская прырода і вынікі працы чалавека па яе пераўтварэнні: балоты, азёры (Целяханы), грэбля (Вулька-Рэчыцкая), Агінскі канал (Целяханы), асушка балот (маёнтак Восаў). Нярэдка яму шчасціла сфатаграфаваць сустрэтых непасрэдна ў дарозе сялян на вазах (каля вёсак Семакі, Жыцін, Сенчыцы), жанчын, які збіралі ў лесе грыбы (Шчыткавічы), або пахавальную працэсію (Вялікія Аўцюкі, Плотніца).

Асабліва каштоўнымі з'яўляюцца этнаграфічныя фотапартрэты І. Сербава. Ён фатаграфаваў сялян у рост, у фас, профіль і ззаду, імкнуўся паказаць асаблівасці іх антрапанімічнага выгляду, адзенне, галаўныя уборы. Серыі фотаздымкаў аднаго, або некалькіх персанажаў у розных ракурсах — вядомы ў этнаграфічнай фатаграфіі прыём. Серыйныя здымкі І. Сербава ствараюць паўнату і стэрэаскапічнасць уражання, і здаецца, аўтар такім чынам пераадольваў абмежаванасць спосабу фотафіксацыі, імкнуўся дасягнуць якасці кінадакументальнасці.

Этнограф безумоўна меў мастацкія здольнасці да кампаноўкі фігур у прасторы фотакадра, пошуку адпаведнага ракурсу, кропкі знаходжання аб'ектыва. Ён быў надзелены асаблівым бачаннем візуальнага антраполага. Выбар персанажаў для фатаграфавання сведчыць аб яго імкненні паказаць увесь спектр чалавечага жыцця. На фотаздымках паўстае галерэя жанчын і мужчын рознага ўзросту — бабуль, дзядоў, маладзіц і хлопцаў, дзяўчат, а таксама дзяцей — немаўлят на руках сваіх маці, падлеткаў, занятых вясковай працай. Класікай жанру этнаграфічнай фатаграфіі можна лічыць фотаздымак трох маладых жанчын з сям'і Герменчукоў (Дражын) з маленькімі дзецьмі на руках і двума хлопцамі побач са сваімі маці. Кампазіцыя і рытмічная арганізацыя гэтага здымка па-мастацку бездакорная.

І. Сербаў выдатна спраўляецца з шматфігурнымі кампазіцыямі, з кампаноўкай выяў трох, двух чалавек. Прынцып памнажэння тыпова апранутых людзей — мужчын у доўгіх кашулях, падпяразаных паясамі, з торбачкамі — калітамі, у палатняных портках, лапцях, саламяных брылях (Хатынічы, Прудок, Пажог), жанчын у намітках, адмыслова завязаных на галовах хустках, палатняных сарочках, фартухах (Гарадная, Вялікія Аўцюкі, Тураў, Давыд-Гарадок), упэўнівае гледача ў тыповасці зафіксаваных з'яў. Адзіночныя выявы жанчын з в. Лучнікі і Красны Бераг, якія

сядзяць за калаўротамі, па дасканаласці мастацкай кампазіцыі можна суаднесці з жывапіснымі палотнамі старых майстроў.

Жыхары палескіх вёсак і мястэчак на фотаздымках І. Сербава паказаны прыгожымі і годнымі. Белае палатнянае адзенне з далікатным арнаментам, яго чысціня, адмысловыя формы намітак на галовах жанчын сведчаць аб асаблівай высокай культуры, уласцівай сялянам. Сярод палескіх фотаздымкаў зусім няшмат такіх, на якіх заўважаеш беднасць, убогасць, жабрацтва сялянства. У большасці яны сведчаць аб дастатку беларускіх сялян і мястачкоўцаў у пачатку XX ст. Заможнасць сялянскага насельніцтва Беларусі этнограф неаднаразова падкрэсліваў і ў сваіх этнаграфічных нататках і справаздачах па экспедыцыях.

Калі разглядаеш фотаздымкі, падаецца, што людзі на іх цалкам натуральныя. Яны быццам бы прыпыніліся на хвілінку каля драўлянай сцяны хаты, гумна, на ганку дома, на вуліцы, адказаўшы ласкавасцю на просьбу фатографа пазіраваць яму. Разам з тым, суадносячы зафіксаванае на здымках з апісаннямі і заўвагамі, якія пакінуў аўтар у сваіх справаздачах, пачынаеш разумець, што не заўсёды тое, што мы бачым на гэтых фотадакументах, на той момант, калі яны былі выкананы, было жывой з'явай. У мястэчках і іншых населеных пунктах, дзе гарадскі лад жыцця пачаў выціскаць мясцовыя этнаграфічныя асаблівасці, І.Сербаў карыстаўся метадам, які можна вызначыць як «этнаграфічная рэканструкцыя». Этнограф пры дапамозе фотаапарата нанава канструяваў тое, што ў сялянскім жыцці ўжо зрабілася мінулым, саступіла сваё месца культурным новаўвядзенням.

Аснашчэнне этнографаў у пачатку XX ст. пераноснай фотатэхнікай істотна змяніла змест і оптыку навуковага бачання. Наяўнасць фотаапарата вымагала ад іх рэтраспектыўнага погляду, давала магчымасць задакументаваць тое, што ўжо знікла, або знікала з жыцця селяніна. Асабліва гэта тычылася старых вясковых пабудоў, традыцыйных строяў адзення сялян і мястачкоўцаў, якія ўжо ў той час імкліва пачалі знікаць з ужытку пад ўплывам гарадской моды.

У справаздачах І. Сербаў неаднаразова адзначае, што сялянскі побыт хутка змяняецца. Асабліва гэта было відавочна ў памежных з палескай зонай раёнах, бліжэйшых да гарадскіх цэнтраў, дзе вёска схілілася ў «бок гарадскога жыцця» і ўсе даўнія пабудовы, начынне, прылады і адзенне замяняліся новымі, а маладое пакаленне хутка пераймала звычкі гараджан, а старадаўняе рукадзелле цалкам выціскалася паркалем[26]. Так ад Навагрудка да Слуцка і па лініі ад Пясочна да Мядведзічаў з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад — у найбольш багатай вобласці ва ўсёй Беларусі, якую этнограф называе «Полем», моладзь у той час апраналася ужо зусім пагарадскому: дзяўчаты насілі модныя сукенкі і прычоскі, ужывалі пальчаткі і парасоны; хлопцы — пінжачныя пары і манішкі, паяркавыя капелюшы і мелі пры сябе гадзіннікі. І. Сербаў піша, што тут усё старое вельмі хутка выціскаецца новым, як у пабудовах, так і ў адзенні[27].

Даследчык заўважае усё больш відавочныя праявы капіталістычнага засваення Палескага краю. У справаздачы па экспедыцыі 1913 г. ён пісаў: «Доўгі час заставалася дзікае Палессе ў сваёй першабытнай прыгажосці некранутым. Аднак цяпер гэта не так. Распрацоўваюцца лясы, асушаюцца балоты на Палессі. Перасяленцы, рабочыя і рознага роду прамыслоўцы навадніліне толькі палескія мястэчкі, а нават самыя глухія пасёлкі. У непраходных гушчарах запыхкалі фабрыкі і заводы, запрацаваў паравік. Няма цяпер ні прывольных выпасаў, ні лясоў, ні вольных зямель. Хоцькі-няхоцькі павольны паляшук зашавяліўся і зрушыўся на заробкі ў чужыя краіны і нават за мяжу ў Амерыку»[28]. Сваім фотаапаратам этнограф фіксуе лясныя заводы па перапрацоўцы дрэва (Буды), меліярацыйныя працы (Восаў), тыпы перасяленцаў (Мядзведзічы), вынікі рассялення сялян з вёсак на хутары (Жыцін) і іншае.

Аднак асабліва даследчыка цікавіла адыходзячая натура — праявы даўняга побыту, старадаўняе адзенне. Па яго просьбе жанчыны навівалі на галаву намітки і апраналі строі, якія на той час у мястачковым і вясковым побыце выйшлі з ужытку. Этнограф неаднаразова падкрэсліваў, што старадаўнія традыцыі адзення захавала старэйшае пакаленне. На фотаздымках І. Сербава не заўсёды лёгка адрозніць тое, што з'яўляецца вынікам удалай рэканструкцыі фрагментаў ады-

26 Сербов, И.А. Поездка по Полесью летом 1912 г. С. 72.
27 Тамсама. С. 74-75, 77.
28 Справаздача аб паездцы І.А. Сербава на Пінскае Палессе летам 1913 года. Арк. 22.

ходзячай палескай этнаграфічнай архаікі, ад таго, што ён здолеў ухапіць на негатыве як момант сучаснасці. Этнакультурная стракатасць Палесся, разнастайнасць і шматаблічча лакальных культур, прысутнасць у сінхронным зрэзе этнаграфічнай рэчаіснасці фрагментаў даўніны дазваляла даследчыку стварыць візуальны вобраз Палесся, які з аднаго боку ёсць «стоп-кадр» цяперашняга часу, з іншага — адноўлены фрагмент мінуўшчыны.

У тых раёнах, дзе традыцыйная культура пакуль яшчэ не была парушана і захоўвала прыкметы сваёй лакальнай непаўторнасці, этнограф падрабязна апісваў мясцовыя звычаі і фіксаваў на фотаздымках старадаўнюю вопратку. Прыкметы выразнай палескай культуры ён назіраў, напрыклад, у пабудовах, адзенні, прыладах і хатнім начынні, звычаях, павер'ях, песнях, мове пінчукоў Загароддзя ў наваколлі Пінска.

Зручная пераносная фотакамера «Кодак» дазваляла ухапіць жыццёвыя моманты, якія былі непадуладныя рэжысуры. Этнограф назірае і фатаграфуе жывыя сцэнкі на вясковых вуліцах у святочныя дні, каля прыходскай царквы, на кірмашах (Петрыкаў, Дражна). Гэты рэпартажны метад ён назваў «імгненнае фатаграфаванне»[29]. Гэта патрабавала ад фатографа імгненнай рэакцыі, каб дастаць фотаапарат, усталяваць патрэбную экспазіцыю, навесці рэзкасць і ўставіць шкляную пласцінку для атрымання негатыва.

Неацэнным дадаткам да візуальнай інфарматыўнасці здымкаў, з'яўляюцца ўласнаручныя аўтарскія анатацыі этнографа. Выкананы яны дасканала і прафесійна. У тэкстах пазначаны месца (вёска, павет), імя, прозвішча, полаўзроставы стан («девіца», «бабухна» і інш.), прыналежнасць да пэўнай этнаграфічнай групы насельніцтва («выбранцы», «сакуны» і інш.), рост у аршынах і вяршках тых, хто сфатаграфаваны. Часткова подпісы зроблены на беларускай мове (пераважна назвы вёсак), або на мясцовай гаворцы. Тэксты каштоўныя дакладнай антрапалагічнай інфармацыяй аб узросце і росце зафіксаваных беларусаў, старабеларускімі імёнамі вяскоўцаў і іх мясцовымі варыянтамі: Пракседа, Прузына, Куліна, Міхаліна, Параска, Адарка, Агапка, Аўхімія, Саўка, Антось, Лоўгін, Нячыпар і іншыя.

Фотаздымкі І. Сербава выдатна ілюструюць асаблівасці антрапалогіі і матэрыяльнай культуры асобных груп насельніцтва вылучаных даследчыкам этнаграфічных раёнаў Беларусі.

Трэба адзначыць, што тэарэтычныя падыходы вучонага да вылучэння этнаграфічных груп на Беларускім Палессі не раз былі падвергнуты крытыцы, як яго сучаснікамі, так і беларускімі этнографамі нашага часу. Так, напрыклад, навуковы даклад І. Сербава «Прычыны родавага быту на Палессі» 16 лістапада 1913 г. на паседжанні чарговага сходу Паўночна-Заходняга аддзелу, у якім ён выклаў вынікі сваіх назіранняў пад час этнаграфічных вандровак ў Мінскую і Гродзенскую губерні, выклікаў вострую дыскусію сярод прысутных і крытыку абранага даследчыкам метаду[30]. Больш разгорнутае навуковае абгрунтаванне сваіх падыходаў пад назвай «Прыкметы абшчыннага быту на Палессі» І. Сербаў змясціў ва уводзінах да выдання працы «Беларусы — сакуны», якая убачыла свет у 1915 г.[31]. Этнограф вылучае асобныя родавыя абшчыны, якія складаюцца з некалькіх паселішчаў, размешчаных на геаграфічна ізаляваных тэрыторыях. Кожная з абшчын на той час захоўвала ўласную індывідуальную матэрыяльную і духоўную культуру, і тэрытарыяльна абшчыны адрозніваліся паміж сабой у культурна-побытавых адносінах[32]. Разам з тым, даследчык не заўсёды браў пад увагу ўсю сукупнасць фактараў, якія абумовілі разнастайнасць і нават стракатасць этнаграфічнага ландшафту Беларускага Палесся. Як этнограф-палявік ён неаднаразова вяртаўся ў тыя раёны, дзе найбольш выразна захаваліся прыкметы старадаўняга абшчыннага быту і культуры мясцовага насельніцтва, падрабязна апісаў іх у сваіх экспедыцыйных справаздачах, працах «Беларусы-сакуны» і «Вічынскія паляне» і пакінуў нам выдатную візуальную дакументацыю па гэтых раёнах.

На яго фотаздымках бачым выбранцаў, сакуноў, палян, палешукоў. Назвы этнаграфічных груп зафіксаваны аўтарскімі подпісамі. Сакуны — насельнікі невялікага раёна паміж Слуц-

29 Сербов И.А. Поездка по Полесью летом 1912 г. С. 100.

30 Пратакол чарговага сходу ПЗА ІРГТ ад 16 лістапада 1913 г. Гл. VBU RS, F 34, b. 711, l. 34.

31 Сербов, И.А. Признаки общинного быта на Полесье: полешуки / И.А. Сербов // Сб. отделения рус. языка и словесности Импер. Акад. Наук. — Петроград, 1915. — Т. XCIV, № 1. — С. I- XVII.

32 Тамсама. С. II.

кам і Асіповічамі у верхоўях ракі Пціч і яе прытока Арэсы (памежжа Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці і Старадарожскага раёна Мінскай вобласці), выдзяляліся «сакаючай» гаворкай (вымаўленне ў дзяслоўных канчатках «-са» замест «-ся»). У пачатку XX стагоддзя сакуны яшчэ захоўвалі архаічныя праявы сваёй культуры ў амаль што некранутым выглядзе, аб чым пераканаўча сведчаць фотаздымкі І. Сербава з вёсак Жыцін, Дражна, Юравічы і іншых.

Выдатная серыя фотаздымкаў зроблена этнографам у слуцкіх вёсках Лучнікі, Бондары, Варкавічы, Падзер, дзе жылі нашчадкі выбранцаў — ваенна-служылага насельніцтва, якія з'явіліся ў Вялім Княстве Літоўскім у XVI ст. У пачатку XX ст. толькі ў наваколлі Слуцка выбранцы захавалі свае культурныя адметнасці, і па вонкавым выглядзе выразна выдзяляліся сярод навакольнага насельніцтва. Фотаздымкі сведчаць аб антрапалагічных асаблівасцях нашчадкаў людзей, калісьці выбраных паводле выдатным фізічных якасцей і росту на вайсковую службу, ня страчанай імі на працягу стагоддзяў ўласнай «выбранецкай» годнасці, сфарміраванай ва ўмовах іх вольнага ад паншчыны сацыяльнага становішча.

І. Сербаў падкрэслівае антрапалагічныя і апісвае культурна-побытавыя асаблівасці палешукоў — жыхароў розных лакальных раёнаў, напрыклад, пінчукоў, палешукоў Зарэчча, жыццё якіх злучана з галоўным сродкам мясцовага транспарту — чоўнам; насельніцтва Любашаўскага раёна (Валынская вобласць, Украіна), які «складае выразную этнаграфічную мяжу паміж дрыгавічамі і драўлянамі»[33], жыхароў вёсак, размешчаных паміж нізоўямі Прыпяці і Дняпра, дзе адзначаецца пераход ад Палесся да Падняпроўя, якія «выразна адрозніваюцца ад палешукоў, як па выгляду, так і па ладу жыцця»[34].

Альбомы фотаздымкаў па ўсіх сваіх экспедыцыях І. Сербаў перадаў у Паўночна-Заходні аддзел ІРГТ у Вільне. На падставе яго справаздач, а таксама штогадовых справаздач Аддзела можна меркаваць аб агульнай колькасці фотаздымкаў, зробленых даследчыкам падчас вандровак: у 1911 г. — каля 1000 фотаздымкаў, 1912 г. — каля 600[35], 1913 г. — каля 500 фотаздымкаў[36]. Такім чынам за тры гады ён выканаў не менш за 2100 фотаздымкаў[37]. Але дакладна не вядома ці ўсе яны трапілі у Паўночна-Заходні аддзел ІРГТ? Частка фатаграфій 1911 г. была страчана падчас выпадку ў Смаленску, некаторыя фотаздымкі І. Сербаў перадаў у Мінскаму царкоўна-археалагічнаму музею. Яны захаваліся са штампам музея ў зборы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

Геаграфія здымкаў ахоплівае значную тэрыторыю сучасных Мінскай, Магілёўскай, Брэсцкай, Гомельскай абласцей, і яны прадстаўляюць традыцыйную культуру такіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў як Заходняе і Усходняе Палессе, паўднёва-ўсходняя частка Цэнтральнай Беларусі.

Параўнанне колькасці віленскіх фотаздымкаў са справаздачнымі лічбамі, суаднясенне іх лакалізацыі з пералікам даследаваных населеных пунктаў дазваляе сцвярджаць, што захавалася далёка не поўная калекцыя фотаматэрыялаў, сабраных І. Сербавым па праграме Паўночна-Заходняга аддзела ІРГТ. Да нашага часу дайшла прыкладна чацвёртая частка фатаграфічнай спадчыны этнографа. У асноўным гэта фотаздымкі, якія былі выкананы ім у 1912 г. Сярод іх ёсць некалькі фатаграфій, які былі зроблены ў 1911 г. Няма ў віленскім зборы фотадакументацыі яго падарожжа 1913 г., аб чым мы можам меркаваць на падставе параўнання зробленага намі геаграфічнага вопісу калекцыі з пералікам даследаваных пунктаў палескіх паветаў былой Гродзенскай губерні, пералічаных у рукапіснай справаздачы этнографа па гэтай вандроўцы. У 1913 г. І. Сербаў наведаў мястэчкі Бездзеж, Хомск, Пагост-Загародскі, Целяханы, Парахонск, Кажан-Гарадок, вёскі Вуйвічы і Дзераўная Слонімскага павета, Дзятлавічы, Дубай, Замошша Кобрынскага павета. У гэтай вандроўцы ён апісваў і фатаграфаваў ўсё, што больш ці менш заслугоўвала ўвагі ў справе вывучэння этнаграфіі краю[38]. І. Сербаў пісаў: «...Такім чынам, саставіў новы альбом фатаграфічных картачак этнаграфічнага зместу, усяго ў колькасці да 500 асобных фотаздымкаў.

33 Сербов И.А. Поездка по Полесью летом 1912 г. С. 95.
34 Тамсама. С. 101-102.
35 Тамсама. С. 70.
36 Справаздача аб паездцы І.А. Сербава на Пінскае Палессе летам 1913 г. Арк. 23.
37 І.К. Цішчанка ў згаданых артыкулах прыводзіць лічбу агульнай колькасці фотаздымкаў — 5000 адзінак.
38 Справаздача аб паездцы І.А. Сербава на Пінскае Палессе летам 1913 г. Арк. 20.

Hitlya Ehrenburg, 55 years old, 2 arshins and 3 vershoks, and Shmerke Ehrenburg, 60 years old, 2 arshins and 4 vershoks. Village of Rudnya in Babruisk uyezd. 1912. (v. Rudnya, Svetlahorsk district, Homiel region).

F 46–1613

Вуліца. Вёска Язвін Бабруйскага павета. 1912 г. (в. Язвін, Светлагорскі раён, Гомельская вобласць).
A street. Village of Yazvin in Babruisk uyezd. 1912. (v. Yazvin, Svetlahorsk district, Homiel region).

46–413

Возера. Вёска Язвін Бабруйскага павета. 1912 г. (в. Язвін, Светлагорскі раён, Гомельская вобласць).

A lake. Village of Yazvin in Babruisk uyezd. 1912. (v. Yazvin, Svetlahorsk district, Homiel region).



F 46–1625

Двор заможнага селяніна Піліпа Юденкі. Сяло Парычы Бабруйскага павета. 1912 г. (г.п. Парычы, Светлагорскі раён, Гомельская вобласць).

The yard of prosperous farmer Pilip Yudenka. Village of Parychy in Babruisk uyezd. 1912. (urban-type settlement of Parychy, Svetlahorsk district, Homiel region).

F 46–401

Касцы. Сяло Парычы Бабруйскага павета. 1912 г.
(г.п. Парычы, Светлагорскі раён, Гомельская вобласць).

Haymakers. Village of Parychy in Babruisk uyezd. 1912.
(urban-type settlement of Parychy, Svetlahorsk district, Homiel region).

F 46–416

Касцы. Сяло Парычы Бабруйскага павета. 1912 г.
(г.п. Парычы, Светлагорскі раён, Гомельская вобласць).

Haymakers. Village of Parychy in Babruisk uyezd. 1912.
(urban-type settlement of Parychy, Svetlahorsk district, Homiel region).

F 46–410

Касцы. Сяло Парычы Бабруйскага павета. 1912 г.
(г.п. Парычы, Светлагорскі раён, Гомельская вобласць).

Haymakers. Village of Parychy in Babruisk uyezd. 1912.
(urban-type settlement of Parychy, Svetlahorsk district, Homiel region).

F 46–396

Касцы. Сяло Парычы Бабруйскага павета. 1912 г.
(г.п. Парычы, Светлагорскі раён, Гомельская вобласць).

Haymakers. Village of Parychy in Babruisk uyezd. 1912.
(urban-type settlement of Parychy, Svetlahorsk district, Homiel region).

F 46–447

Іван Руды ў дарозе. Вёска Семак Бабруйскага павета. 1912 г.
(далучана да в. Гамза, Светлагорскі раён, Гомельская вобласць).

Ivan Rudy on the road. Village of Semak in Babruisk uyezd. 1912.
(Joined to v. Hamza, Svetlahorsk district, Homiel region).

F 46–450

Іван Руды ў дарозе. Вёска Семак Бабруйскага павета. 1912 г.
(далучана да в. Гамза, Светлагорскі раён, Гомельская вобласць).

Ivan Rudy on the road. Village of Semak in Babruisk uyezd. 1912.
(Joined to v. Hamza, Svetlahorsk district, Homiel region).

F 46–448

Іван Руды ў дарозе. Вёска Семак Бабруйскага павета. 1912 г.
(далучана да в. Гамза,Светлагорскі раён, Гомельская вобласць).

Ivan Rudy on the road. Village of Semak in Babruisk uyezd. 1912.
(Joined to v. Hamza, Svetlahorsk district, Homiel region).

F 46–449

Іван Руды ў дарозе. Вёска Семак Бабруйскага павета . 1912 г.
(далучана да в. Гамза, Светлагорскі раён, Гомельская вобласць).

Ivan Rudy on the road. Village of Semak in Babruisk uyezd. 1912.
(Joined to v. Hamza, Svetlahorsk district, Homiel region).

F 46–409

Іван Руды ў дарозе. Вёска Семакі Бабруйскага павета. 1912 г.
(далучаны да в. Гамза, Светлагорскі раён, Гомельская вобласць).

Ivan Rudy on the road. Village of Semak in Babruisk uyezd. 1912.
(Joined to v.Hamza, Svetlahorsk district, Homiel region).

F 46–1624

За кудзеляй Мар'я Мароз. Вёска Красны Бераг Бабруйскага павета. 1912 г. (в. Красны Бераг, Жлобінскі раён, Гомельская вобласць).

At a tow — Marya Maroz. Village of Krasny Berag in Babruisk uyezd. 1912. (v. Krasny Berag, Zhlobin district, Homiel region).


ЖЫЦІН
КРЫНКІ
ПТУШЫЧЫ
ЮРАВІЧЫ
ЯЗВІНКА
ШЫЛТКАВІЧЫ
ДРАЖНА
КУЛЬШЫЧЫ

...Грэск служыць як бы мяжой паміж «палянамі» і «сакунамі». Адсюль на паўночны ўсход цягнецца найчысцейшая Дрыгва з славутымі паселішчамі Дражыным, Жыціным і інш., якія ў вышэйшай ступені выдатна захавалі прыкметы старажытнай культуры, у той час як паўднёвы захад на Палях усё старое надзвычай хутка выціскаецца новым, як у пабудовах, так і ў адзенні.

Поездка по Полесью летом 1912 г. С. 72.

Сакуны, частка самага вялікага беларускага племені дрыгавічоў, насяляюць верхняе цячэнне р. Пціч і яе прытока Арэсы. Сакунамі называюцца яны таму, што ўсе дзеясловы на «ся» ў іх заканчваюцца цвёрда на «са», напрыклад: выспаўса, нагукаласа, завернеса, прагуляймаса, абачхніса. Паводле статыстычных звестак агульная колькасць сакуноў у цяперашні час (звесткі на 1915 год. — рэд.) налічваецца 10 200 чалавек, з якіх 5300 мужчын і 4900 жанчын.

Пасяленні іх — Жыцін, Юравічы, Крамок, Церабуты, Шчыткавічы, Ляўкі, Дражын, Падарэссе, Залужжа і некалькі засценкаў, — размясціліся на невялікіх нізінных астраўках, сярод непраходных багнаў і балот Верхняга Палесся, на мяжы Ігуменскага і Бабруйскага паветаў Мінскай губерні.[...] Жывучы на сваіх амаль недаступных астраўках, усімі забытыя, сакуны да апошняга часу захавалі шмат самабытнага.

Беларусы-сакуны. // Полымя. — 2011. — № 8. С. 158.

...Hresk serves as a boundary between the «Palyans» and the «Sakuns». Hence, on the north-east there stretches the purest Drygva with its famous villages of Drazhyn, Zhytsin et al., which remarkably well preserved the signs of ancient culture, while in the south-west in Pali all the old is very quickly supplanted by the new, both in buildings and in clothes.

The trip to Palessie in the summer of 1912. P. 72.

The Sakuns, part of the largest Belarusian Dregovichs tribe, inhabit the upper reaches of the Ptsich River and its tributary Aressa. They are called Sakuns because all their verbs with the ending «-tsia» are pronounced by them firmly in the «-sa», for example, vyspausa, nagukalasa, zavernesa, pragulyaimasa, abachknisa, etc. According to statistics, the total number of the Sakuns is currently (as of 1915. — ed.) 10,200 people, of whom 5,300 are males and 4,900 are females.

Their settlements — Zhytsin, Yuravichy, Kramok, Tserabuty, Shchytkavichy, Lyauki, Drazhyn, Padaresse, Zaluzhzha and several farms, are located in small low-lying islands among impenetrable swamps and marshes of the Upper Palessie, on the border of Igumen and Babruisk uyezds in Minsk province. [...] While living in their almost inaccessible islets, forgotten by all, the Sakuns until recently have saved a lot of originality.

The Belarusian Sakuns. Polymja. — 2011. — № 8. P. 158.

F 46–415

Лавы ўзімку. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г. (в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).*

*Benches in winter. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911. (v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).**

Вялікае сяло Жыцін на правым беразе р. Пціч: 200 двароў, 1600 душ абодвух палаў. Паводле падання сяло названа Жыціным таму, што заўсёды на палетках атрымлівалі добрыя ўраджаі.

Беларусы-сакуны. С. 159.

There is a large village of Zhytsin on the right bank of the Ptsich: 200 yards, 1,600 souls of both sexes. According to a legend, the village is called Zhytsin because they always get good crop yields.

The Belarusian Sakuns. P. 159.

F 46–745

Паляшук з палукашам. Балота Ясень. 1911 г. (Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

A Paleshuk with a palukash. Swamp Yasen. 1911. (Asipovichy district, Mahilyow region).

F 46–405

Поле пшаніцы. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

A wheat field. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

F 46–395

Мар'я Мароз бярэ маніцы. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён Магілёўская вобласць).

Marya Maroz picking staminate hemp. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

Сені — без падлогі і столі. У красным куце змяшчаецца ікона, каля сцяны — лавы. Тут жа віднае месца займаюць жорны і ступа. Далей нагрувашчаны бочкі, цэбры, кублы, кадкі, кашы, лазбянкі, сытнікі, ночвы, дзежкі, начоўкі, рашоты, біклагі, а на паліцах, круках і шастах размяшчаюцца адзенне, зброя, інструменты, сярпы і косы. Летам сям'я сакуна жыве большай часткаю ў сенях, дзе больш прахалоды і спакойна ад насякомых, мух і прусакоў[...]

Сярод хаты пад столлю вісіць, у выглядзе вялікага звона, сплецены з лазы і абмазаны глінай «лушнік». Унізе да яго прычэплены квадратная жалезная рашотка, перасвет, на якім па вечарах гараць смалякі, або, па мясцовым выразе, «лучына». Для выхаду дыму праз столь і дах устроена драўляная труба. Лушнік добра асвятляе і сагравае хату. У доўгія асеннія і зімовыя вечары сям'я сакуна прымошчваецца вакол лушніка са сваёй работай: хто прадзе, хто тчэ кросны, хто шые, хто лапці пляце. Можна меркаваць, што лушнік ёсць рэшткі таго старадаўняга агменя, які ўстанаўлівалі славяне пасярод сваіх хацін.

Беларусы-сакуны. С. 162

F 46–1619

Сям'я сакуна Міхаіла Шляхціна. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Sakun Mikhail Shlyakhtin's family. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

The inner porch is without a floor and a ceiling. In the red corner there is an icon; benches are placed against the wall. Also, a prominent place is occupied by millstones and a mortar. Next, there are heaped barrels, tubs, lidded buckets, vats, baskets, basins, bowls, washing tubs, sieves and flasks, and on shelves, hooks and poles there are clothes, harness, tools, sickles and scythes. In summer the Sakun family lives mostly in the inner porch, where it is more cool and calm of insects, flies and cockroaches[...]

395

In the middle of the room there is a «lushnik» hanging from the ceiling in the form of a large bell, woven of cane and covered with clay. Down there is clinged to it a square iron grating, relight, on which at night pitch oil torches are lit, or at a local expression, «luchyna». For smoke to come out through the ceiling and the roof, a wooden tube is installed. The lushnik well illuminates and warms the house. In the long autumn and winter evenings the Sakun family find a place for themselves around the lushnik with their job: one spins, one weaves nets, one sews, one makes bast shoes. We can assume that the lushnik is a remnant of an ancient hearth, which the Slavs set in the middle of their huts.

The Belarusian Sakuns.Translated. P. 162.

F 46–394

На двары каля сенцаў. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

In the courtyard at the inner porch. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

F 46–393

Уборка сена. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Gathering hay. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).



F 46–1617

Хутар Мікіты Латынніка. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Mikita Latynnik's farm. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

F 46–1616

Пасля рассялення на хутары. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).*

After settling on a farm. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
*(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).**

Дзякуючы сваёй працаздольнасці, сакуны жывуць даволі заможна. Пабудовы ў іх добрыя, адзення дастаткова, хлеба хапае да новага, жывёлы трымаюць многа, напрыклад, у сярэдняй гаспадарцы бывае да 10 галоў рагатай жывёлы.

На адным баку сядзібы, на адлегласці 1½—2 сажні ад вуліцы, за частаколам стаіць невялікая, звычайна 9×8 аршын, хата з бярвення, рубленая ў вуглы. Падмурка зусім няма; першы вянец кладзецца проста на зямлю або на камяні, абгароджваецца кругом тонкімі бярвёнамі і абсыпаецца зямлёй. Такая заваліна называецца «прызбай». Высокі доравы або гонтавы дах, з двума крутымі схіламі, а таксама з карнізам і абшытым шчытом, або франтонам, сперади. Па самым версе ўздоўж усяго даху цягнецца «воўк», збіты з дзвюх доўгіх дошак. Краі абодвух схілаў каля самага франтона абшыты дошкамі, якія называюцца закрылінамі.

У хаце абавязкова тры маленькія акенцы, з якіх адно на вуліцу і два ў двор. Чацвёртага акна ў сваёй хаце сакун нізавошта не прасячэ. У Ляўках, калі сялянская хата была адведзена пад земскую школу, гаспадар хаты прасякаў чацвёртае акно ў хаце толькі з бласлаўлення святара і дазволу сельскага сходу. У старых курных хатах маленькія, 8 × 5 вяршкоў, аконцы неасаджаныя, гэта значыць без лутак, з дашчатымі засоўкамі замест рамаў...

Курныя хаты ўжо сустракаюцца як рэдкасць, і толькі ў беднякоў.

Беларусы-сакуны. С. 160–161.

Due to their efficiency, the Sakuns live quite well off. Buildings are good, there is enough clothing, enough bread till new crops, they have a lot of cattle, for example, the average household has up to 10 head of cattle.

On one side of the estate, at a distance of 1½–2 sazhens from the street, behind a fence there is a small, usually 9×8 arshins, house made of logs, put up at the corners. There is no foundation at all; the first row of logs is placed directly on the ground or on rocks, and is surrounded around with thin logs and covered with the ground.This mound of earth is called «pryzba». High doravy or shingle roof, with two steep slopes, as well as with the eaves and panelled shield, or a gable, in front. On the top of the roof there extends along the «vouk» knocked together of two long boards. The edges of both slopes near the gable are covered with boards, which are called «zakryliny».

In the house there are obligatory three small windows, one of which is streetward, and two open on the yard. The Sakun would never cut the fourth window in his house. In Lyauki, when the peasant hut was transformed into a zemstvo school, the hut's owner cut the fourth a window in the house only with the blessing of the priest and on permission of the village gathering. In an old hut heated by a chimneyless stove, little windows, 8 × 5 vershoks, are not upset, that is without a lutak (lateral side of a door frame for hanging doors) with wooden bars instead of frames...

Huts heated by a chimneyless stove are already there as a rarity, and only the poor live in them.

The Belarusian Sakuns. P. 160–161.

F 46–1620

Хутар Ігната Дубіны. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Ignat Dubina's farm. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

Двор сакуна шчыльна забудаваны толькі з двух бакоў і адгароджаны ззаду і ад вуліцы праслам ці частаколам, з рэдзенькімі вешніцамі замест варот. Такі двор мае выгляд нейкага цеснага праходу або калідора.

Беларусы-сакуны. С. 160.

The Sakun's yard is densely built up only on two sides and fenced in the back and off from the street by a pass or paling with sparse veshnitsy (pass doors near the gate) instead of the gate. Such a courtyard has the form of a narrow passage or corridor.

The Belarusian Sakuns. P. 160.

F 46–1622

Двор сакуна Васіля Жыцянка. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Sakun Vasil Zhytsyanka's yard. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

У сакуноў да апошняга часу захавалася саха, якая мала чым адрозніваецца ад першабытнага рала. Гэта не што іншае, як доўгая каранастая крывуліна, ствол якой служыць дышлем, а два тоўстыя карані — ручкамі, з якіх правая называецца мыльніцай, а левая адмылкам. Да ніжняга выгнутага боку крывуліны пад вострым вуглом прыроблена асінавая плашка з рогам, на якім прыбіты лемяхі.

Вялікія дубовыя вілы з двума шырокімі капачамі называюцца «сахаром», які вельмі падобны на плашку сахі. Сакуны так па-майстэрску працуюць сахаром — нарываюць гной на вазы, ускопваюць перагніўшы «чарот» і цвёрды зём на двары, што міжволі з'яўляецца думка, ці не будзе сахор продкам сахі і сучаснага плуга. Барана — старадаўняй канструкцыі, звязаная і збітая з вітых лазовых кольцаў і тоўстых бярозавых прутоў, з дубовымі зубамі і «самайлукам». Падляжкі, або падсекі, падымаюць матыкамі і баруюць смыкамі, звязанымі з сырых і сукаватых яловых вершалін. Сярпы, бабкі і малаткі куюць сакунам мясцовыя кавалі, а косы прадаюць крамнікі.

Пры ўборцы сена на багністых паплавах сакуны ўжываюць, акрамя вілаў і грабляў, яшчэ доўгія жэрдкі-насілкі для носкі сена да аднаго стога. Вазы снапоў і сена па-старадаўняму ўціскаюцца «рублём» і ўвязваюцца вяроўкамі.

Беларусы-сакуны. С. 164.

Until recently the Sakuns have remained a wooden plough, which is not much different from a primitive ploughshare. It is nothing but a long chunky curve whose trunk is used as a drawbar, and two thick roots as handles, the right of which is called a soap box, and the left — a remnant of a cake of soap. At right angles to the lower part of the arched side of the curve there fastened an aspen cutter with a horn, to which plough shares are tacked.

A big oak pitchfork with two wide lifter points is called «sakhor» (fork), which is very similar to the wooden plough cutter. The Sakuns so masterfully work with the sakhor — they dig out humus into carts, dig up digested «rush» and the solid earth in the yard that inadvertently a thought appears, if would not it be that «the sakhor» is an an ancestor of a wooden plough and a modern plow. The harrow is an old construction bound and tacked with twisted willow rings and thick birch twigs, with oak teeth and «samayluk» (a harrows base). Underbrushes, or slash and burn clearings are fallowed by hoes and harrowed by bows bound from raw spruce tops with many boughs. Sickles, mandrels and hammers for the Sakuns are forged by local blacksmiths, and shopkeepers sell braids.

When harvesting hay in swampy flood plains, the Sakuns use also, except pitchforks and rakes, long poles-stretcher to carry hay to one stack. Carts with sheaves and hay are pressed in the old way by the «ruble» (a thick pole) and tied with ropes.

The Belarusian Sakuns. P. 164.

F 46–1621

Двор сакуна. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

The Sakun's yard. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).



F 46–407

Хутар Васіля Латыніка. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Vasil Latynik's farm. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

F 46–437

Матруна Шляхціна на хутары. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г. (в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Matruna Shlyakhtina on the farm. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911. (v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

F 46–1615

Хутар Сцяпана Лагуткі. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г. (в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Stsyapan Lahutka's farm. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911. (v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

У кожным пасяленні ёсць некалькі грамадскіх сушань, дзе сакуны сушаць каноплі і лён і потым мнуць іх у маленькіх церніцах. Гэтыя сушні падобныя на беларускія лазні, яны і будуюцца звычайна на беразе рэчкі ці балота, але сакуны зусім не прызнаюць лазні. «Чалавек мыецца двойчы — калі народзіцца і калі памрэ», — гавораць яны.

Беларусы-сакуны. С. 163.

F 46–1614

Хутар Ігната Дубіны. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Ignat Dubina's farm. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

In each village there are several public drying houses where the Sakuns dry hemp and flax, and then break them in small brakes.These drying houses are similar to Belarusian bathhouses, they are usually built on the banks of the river or swamp, but the Sakuns do not recognize bath. «The man is washed twice — when he is born and when he dies,» — they say.

The Belarusian Sakuns. P. 164.

F 46–1623

Сушня. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

A drying house. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

F 46–455

На рацэ. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

On the river. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

F 46–442

Каравачнік з-пад мястэчка Шацк. Сяло Жыцін Бабруйскага павета . 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

A rag-and-bone man from the town of Shatsk. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

F 46–423

Каравачнік з мястэчка Шацк. Сяло Жыцін Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Жыцін, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

A rag-and-bone man from the town of Shatsk. Village of Zhytsin in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Zhytsin, Asipovichy district, Mahilyow region).

Звычайна на астраўку, на беразе рэчкі або балота, цягнецца доўгаю стужкай пасяленне, акружанае, як лесам, азяродамі. Крывыя вузкія вуліцы на нізкіх месцах высланы галлём у выглядзе грэблі. Адзін канец вуліцы, звычайна лепшы з уезда, называецца белым, а другі — чорным. Большай часткаю каля белага канца вуліцы стаіць высокі драўляны крыж з распяццем, а далей у полі размяшчаюцца могілкі або клады.

Беларусы-сакуны. С. 160.

Usually, on an island, on the river or swamp, there stretches like a long ribbon a settlement surrounded by azyarody like a forest. Curved narrow streets in the low lying areas are paved with branches in the form of a brushwood road.One end of the street, usually the best at the entry, is called white, and the other — black. Usually at the white end of the street there is a tall wooden cross with a crucifix, and then in the field there is a cemetery.

The Belarusian Sakuns. P. 160.

F 46–400

Вуліца. Сяло Крынкі Бабруйскага павета. 1911 г. (в. Крынкі, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).
A street. Village of Krynki in Babruisk uyezd. 1911. (v. Krynki, Asipovichy district, Mahilyow region).

F 46–435

Царква. Сяло Крынкі Бабруйскага павета. 1911 г. (в. Крынкі, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).*

*A church. Village of Krynki in Babruisk uyezd. 1911. (v. Krynki, Asipovichy district, Mahilyow region).**

Пчол разводзяць дрыгавічы пераважна ў вялікіх калодах, якія ставяцца на дрэвах па некалькі штук разам. Гэтыя калоды называюць «стаўкамі». На дрэвах пад стаўкамі насцілаюць адзёр ці палаці, каб засцерагчы пчол ад мядзведзя. З зямлі на адзёр прыстаўляецца сукаватая ялінка-лествіца, якая завецца «стравай». На высокае дрэва да стаўкоў дрыгавіч лёгка ўзбіраецца па вяровачнай плеці.

У шмат якіх месцах дрыгавічы ўвогуле не ведаюць борцей на сырастойных дрэвах.

По Дреговичской области летом 1911 г. С. 319.

The Dregovichs keep bees mainly in large decks, which are placed on the trees for a few pieces together. These decks are called «stauka». On the trees under the stauka an adzyor or loft is put to prevent bees from the bear. On the ground on adzyor there is put a knotted herringbone-ladder called «strava». The Dregovich easily climbs a tall tree to the stauka by a plaited rope.

In many other places the Dregovichs do not know wild-honey farming on green trees.

Through the Dregovichy's area in the summer of 1911. P. 319.



F 46–458

Хвядос Кузьміч на лезіве — «плеці». Сяло Крынкі Ігуменскага павета. 1911 г. (в. Крынка, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Khvyados Kuzmich on a climbing rope — «plets». Village of Krynki in Babruisk uyezd. 1911. (v. Krynka, Asipovichy district, Mahilyow region).

411

Пчол разводзяць сакуны ў вялікіх калодах, якія плятнямі ўсцягваюць па некалькі штук на дрэва. Пад «стаўкамі» вакол ствала дрэва нацягваецца «адзёр», гэта значыць квадратныя палаткі, «штоб мядзведзь не ўзброўса на дрэво і не выдроў мёду». Да «адзёру» прыстаўляецца сукаватая яліна-лазка, прататып нашай лесвіцы. Варта ўвагі, што сакуны не вядуць бортнага пчалярства і борцяў зусім не ведаюць.

Беларусы-сакуны. С. 165.

The Sakuns keep bees mainly in large decks, fences dragged for a few pieces on the tree. Under the «stauka» around a tree trunk they stretch «adzyor», that is the square stalls, «so that the bear could not climb a tree and pull honey.» To the «adzyor» they put knotted herringbone-ladder, a prototype of our stairs. It is worth mentioning, that the Sakuns do not have wild-honey farming and do not know it at all.

Belarusian Sakun. P. 165.

F 46–414

Каля стаўкоў. Вёска Птушычы Бабруйскага павета. 1911 г. (в. Птушычы, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Near «stauka». Village of Ptushychy in Babruisk uyezd. 1911. (v. Ptushychy, Asipovichy district, Mahilyow region).

F 46–419

Варка Міхадзюк з вёдрамі. Вёска Птушычы Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Птушычы, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).*

Varka Mikhadzyuk with buckets. Village of Ptushychy in Babruisk uyezd. 1911.
*(v. Ptushychy, Asipovichy district, Mahilyow region).**

413

Вёска Юравічы таксама на левым беразе р. Пціч, у паўвярсце ад Крамка: 80 двароў, 640 душ абодвух полаў. Юравічы — ад Юркі або ад «юра».

Беларусы-сакуны. С. 159.

F 46–429

The village of Yuravichy is also on the left bank of the Ptsich River half a versta from Kramok: 80 yards, 640 persons of both sexes. Yuravichy is from Yurki or «Jura».

The Belarusian Sakuns. P. 159.

Саўка Музычык арэ на валах. Вёска Юравічы Бабруйскага павета. 1911 г.
(Не існуе, знаходзілася каля в. Крамок, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Sauka Muzychyk ploughing with oxen. Village of Yuravichy in Babruisk uyezd. 1911.
(Does not exist, it was near the village of Kramok, Asipovichy district, Mahilyow region).

Сакуны маюць правільныя рысы твару, большаю часткаю смуглявыя шатэны, доўгагаловыя, сярэдняга росту, моцнага складу, але сухарлявыя. Мужчыны носяць доўгія валасы, падстрыжаныя па-руску ў кружок, з праборам пасярэдзіне, барады не голяць.

Мужчынская белая сацінавая сарочка з кароткім стаячым каўняром, без зборак на плячах, або з прамым каўняром на грудзях і цвіліхамі пад пахамі, — носіцца па-руску навыпуск і зашпільваецца на грудзях металічнаю спражкай. Такія ж белыя парткі — з сядлом, на апаясцы [«ачкуры»]. Зімою паверх портак надзяваюцца яшчэ суконныя белыя штаны. Святочная кужэльная сарочка бывае прыгожа наткана або вышыта на прыпале, каўняры і «каўнерцах» рукавоў.

Сакуны падпяразваюцца доўгім шырокім поясам. Некаторыя паясы бываюць у 1 сажань даўжынёю і больш за вяршок шырынёю. Мужчыны носяць на поясе каліту, нож, шабету з крэменем, трутам і стальным красалам.

Беларусы-сакуны. С. 165, 163.

F 46–422

Саўка Музычык арэ на валах. Вёска Юравічы Бабруйскага павета. 1911 г.
(Не існуе, знаходзілася каля в. Крамок, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Sauka Muzychyk ploughing with oxen. Village of Yuravichy in Babruisk uyezd. 1911.
(Does not exist, it was near the village of Kramok, Asipovichy district, Mahilyow region).

The Sakuns have regular features, mostly they are dusky brown, long-headed, of medium height, strongly built, but lean.The men wear long hair, cut in the circle the Russian way and parted in the middle, they do not shave their beards.

Men's white cotton shirt with a short stand-up collar, with no creases on the shoulders, or with a straight collar on the chest and tsvilikhi (linen inserts) under the arms, is worn untucked in Russian manner and fastens with a metal buckle on the chest.The same are white pants — with a saddle, on a girdle [«achkura»]. In winter white cloth trousers are worn over pants. The holiday linen shirt is beautifully woven or embroidered at the bottom, collars and sleeve cuffs.

The Sakuns tie a long wide waistban]d round their waist. Some waistbands are 1 sazhen long and more than a vershok wide. On their waistband the men wear a kalita, a knife, a tobacco pouch with a flint, tinder and steel flintstone.

The Belarusian Sakuns. P. 165, 163.

F 46–427

Адам Холадок арэ на валах. Вёска Юравічы Бабруйскага павета. 1911 г.
(Не існуе, знаходзілася каля в. Крамок, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Adam Haladok plowing with oxen. Village of Yuravichy in Babruisk uyezd. 1911.
(Does not exist, it was near the village of Kramok, Asipovichy district, Mahilyow region).

F 46–444

Адам Холадок арэ на валах. Вёска Юравічы Бабруйскага павета. 1911 г.
(Не існуе, знаходзілася каля в. Крамок, Асіповіцкага раён, Магілёўская вобласць).

Adam Haladok ploughing with oxen. Village of Yuravichy in Babruisk uyezd. 1911.
(Does not exist, it was near the village of Kramok, Asipovichy district, Mahilyow region).

F 46–430

Даніла Шванок арэ на валах. Вёска Юравічы Бабруйскага павета. 1911 г.
(Не існуе, знаходзілася каля в. Крамок, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Danila Shvanok ploughing with oxen. Village of Yuravichy in Babruisk uyezd. 1911.
(Does not exist, it was near the village of Kramok, Asipovichy district, Mahilyow region).

Сакуны вельмі працалюбівыя і вынослівыя. Здаецца, ім няма ні дня, ні ночы. Каля трэціх «пеўняў» яны ўжо на нагах і застаюцца на рабоце да позняга вечара — то ў полі з валом, то на поплаве з касой, то ў лесе з сякерай. Жанчыны ў працаздольнасці не ўступаюць мужчынам. Калі няма работы дома або ў полі, яны з кашом за плячыма шныраюць па зараснікаx, збіраюць грыбы або ягады; «лакаюць плацця» каля студні ці на рацэ.

Беларусы-сакуны. С. 166.

The Sakuns are very industrious and hardy. They seem to be on their feet from morning till night. They are already up with the birds and stay at work until late in the evening — in the field with an ox, on a meadow with a scythe, in the forest with an ax. The women are not inferior to men in respect of their capacity for work. If there is no work at home or in the field, they search the bush with a basket behind, pick mushrooms or berries, «rinse dresses» near the well or on the river.

The Belarusian Sakuns. P. 166.

F 46–451

Агата Шванок убірае лён. Вёска Юравічы Бабруйскага павета. 1911 г.
(Не існуе, знаходзілася каля в. Крамок, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Ahata Shvanok gathering flax. Village of Yuravichy in Babruisk uyezd. 1911.
(Does not exist, it was near the village of Kramok, Asipovichy district, Mahilyow region).

Лён у сакуноў родзіцца лепш, чым каноплі. Таму канапель сеюць няшмат, а пад лён адводзяць цэлыя палосы. З пянькі ўюць толькі аборы і вяроўкі, неабходныя ў гаспадарцы, а таксама выраблюць рыбалоўныя снасці. Але лён апранае сакуна.

Жанчыны ўсю восень і зіму важдаюцца са сваімі кудзелямі і «прасніцамі», прадуць ніткі, а вясною ставяць кросны і ткуць палатно: тонкае кужэльнае, зрэбнае і дзяругу. З «воўны» выраблюць простае сукно, лямец, рукавіцы і валёнкі.

Беларусы-сакуны. С. 165.

Sakun's flax thrives better than hemp. So, little hemp is sown and large strips are given to flax. They weave of hemp only dags and ropes needed in the economy, and also make fishing tackle. But flax provides clothes for the Sakuns.

The women throughout the autumn and winter are busy with their tows and «prasnitsy» (spindles), spun yarns, and in the spring take their hand loom and weave cloth: fine gingham, linen and shacks. With the «vouna» (wool) they make simple cloth, felt, gloves and knee-high felt boots.

The Belarusian Sakuns. P. 165.

F 46–404

Агата Шванок убірае лён. Вёска Юравічы Бабруйскага павета. 1911 г.
(Не існуе, знаходзілася каля в. Крамок, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Ahata Shvanok gathering flax. Village of Yuravichy in Babruisk uyezd. 1911.
(Does not exist, it was near the village of Kramok, Asipovichy district, Mahilyow region).

F 46–1618

Вуліца пасля дажджу. Вёска Язвінка Бабруйскага павета. 1911 г.
(Месцазнаходжанне не высветлена, магчыма, знаходзілася ў Асіповіцкім раёне Магілёўскай вобласці).

A street after rain. Village of Yazvinka in Babruisk uyezd. 1911.
(Location is not set; perhaps, it was in Asipovichy district of Mahilyow region).

Вёска Шчыткавічы: 200 двароў, 1500 душ абодвух палаў. Шчыткавічы — ад слова «шчыток» — трохвугольнік або ад «шчыта».

Беларусы-сакуны. С. 159.

The village of Shchytkavichy: 200 yards, 1,500 souls of both sexes. Shchytkavichy — from the word «shchytok» (small shield) — a triangle or from «schyt» (shield).

The Belarusian Sakuns. P. 159.

F 46–433

Жанчыны збіраюць грыбы. Сяло Шчыткавічы Бабруйскага павета. 1911 г. (в. Шчыткавічы, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).*

*Women picking mushrooms. Village of Shchytkavichy in Babruisk uyezd. 1911. (v. Shchytkavichy, Staryya Darohi district, Minsk region).**

421

Вёска Дражын: 115 двароў, 960 душ абодвух полаў. Дражын — на драгве.

Беларусы-сакуны. С. 159.

The village of Drazhyn: 115 yards, 960 persons of both sexes. Drazhyn — on drahva (quagmire).

The Belarusian Sakuns. P. 159.

F 46–418

Вуліца ў святочны дзень. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).

A street on a holiday. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

У пасяленнях сакуноў вуліцы па абодвух баках густа забудаваны. Двары доўгія, але вельмі вузкія. На такім двары двое калёсаў з цяжкасцю размінаюцца.

Беларусы-сакуны. С. 160.

In Sakun's settlements the streets on both sides are densely built up.The yards are long, but very narrow. In such a yard, it is very difficult for two carts to pass.

The Belarusian Sakuns. P. 160.

F 46–424

Вуліца ў святочны дзень. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).

A street on a holiday. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

Жаночая сарочка крыху даўжэйшая за мужчынскую, да калень, з адкідным каўняром, полікамі і доўгімі рукавамі, якія бываюць спрэс натканы і нышыты. Кароткая, крыху ніжэй калень, белая спадніца, на поясе, носіцца нізка на паясніцы. Зімою і па святах жанчыны і дзяўчаты носяць кароткія суконныя андаракі або шарсцяныя панёвы з кабатам. Фартух у дзве палы на «скутах», унізе ўвесь прыгожа натыкаецца ці вышываецца. Мужчыны і жанчыны носяць белыя суконныя камізэлькі амаль аднолькавага крою.

Нявесты і маладыя «жанчыны» па святах надзяваюць багата расшытыя пазументамі безрукаўкі ці нагруднікі.

Абуваюцца сакуны ў ліпавыя ці лазовыя лапці, «зрячие», гэта значыць, без вялікай пярэдняй строчкі. Акрамя звычайных пяньковых абор, мужчыны носяць яшчэ і раменныя, а жанчыны — чорныя плеценыя або тканыя. Летам жанчыны ходзяць босыя, але галёнкі завіваюць анучамі. Такія «завойкі» засцерагаюць лыткі ад сіверу. Наогул, лёгкі абутак сакуна вельмі зручны для жыхара балотаў і багнаў, паколькі няшмат упітвае вады і мала збірае гразі.

На галаве сакуны носяць белую або шэрую магерку, абшытую наверсе цёмна-сінім снуркам. Сват надзявае шапку з белай аўчыны з суконным чатырохвугольным верхам. Жанчыны завіваюць свае валасы на макаўцы галавы ў бячэйку, паўзверх надзяваюць вязаны з нітак чапец і павязваюць турбаном намітку, адзін канец якой ахоплівае падбародак, а другі спускаецца ніжэй паясніцы.

Дзяўчаты заплятаюць касу і павязваюць галаву хустай, тонкім ручніком з вышытымі канцамі. Гэтая хуста, што наогул называецца ў Беларусі «шырынкай», самы старадаўні дзявочы галаўны ўбор.

Беларусы-сакуны. С. 163.

A women's shirt is slightly longer than a man's shirt; it is knee-length, with folding collar, frills and long sleeves that are completely woven and sewn. A short knee-length white skirt with a waistband is worn low on the waist. In the winter and on holidays, women and girls wear short skirts or homespun woollen skirts with a sleeveless jacket that is usually wadded or fur-lined. The apron in two flaps at «skuty» is all beautifully pinned on or embroidered at the bottom. Men and women wear white woolen vests almost the same style.

On holidays brides and young women wear richly embroidered laced jackets or plastrons.

The Sakuns wear lime or willow blast shoes, «zryachiye» («seeing», open-toed), that is, without a big front line. Besides the usual hemp dags, men also wear a belt, and women — black braided or woven dags. Women go barefoot in the summer, but the legs are wrapped with an onucha (puttee). Such «zavoiki» (wrappings) protect legs from the north wind. Generally, Sakun's lightweight shoes are very convenient for inhabitants of swamps and marshes, as they absorb water not so much and collect little dirt.

On the head the Sakuns wear a white or gray magerka, edged with a dark-blue lace. A matchmaker wears a hat of white lambskin with cloth quadrangular top. Women weave their hair on the crown of the head in byacheyka, on top they put on knitted cap and tie a turban on the namitka, one end of which extends to the chin, and the other goes down below the waist.

Girls braid their hair and cover their heads with a scarf, a thin towel with embroidered ends. This scarf that is generally called «shyrynka» in Belarus is the oldest girl's headdress.

The Belarusian Sakuns.Translated. P. 163.

Нягледзячы на пастаянныя ў гэтай мясцовасці хваробы — каўтун, ліхаманку і рэўматызм — многія сакуны дажываюць да глыбокай старасці, захаваўшы ў дастатковай ступені здароўе. «Бабухна» з с. Жыцін Аўдоцця Шачок жыве ўжо 86-ы год і добра захавалася. Гадоў сорак таму яна засталася ўдавою. Не паладзіўшы з нявесткаю, Аўдоцця жыве цяпер адна ў сваёй старой курнай хаце, зарабляе на сваё пражыццё падзённай працай: глядзіць за жывёлай, прадзе, шые і ходзіць з сярпом. Мае добрую памяць, зрок і слых, цудоўна расказвае пра мінулае, спявае і танцуе. Такіх бабуль і дзядоў паміж сакунамі многа.

Моладзі, дзяўчат і хлопцаў, амаль нябачна, паколькі сакуны жэняць сваіх дзяцей вельмі рана. 20-гадовы хлопец і 18-гадовая дзяўчына лічацца ўжо старымі. Таму тут не знаюць ні вясёлых карагодаў, ні бестурботных гульняў, ні дзявочых пасядзелак.

Беларусы-сакуны. С. 166–167.

Despite the constant in the area diseases — plica, fever and rheumatism, many Sakuns live to a ripe old age, retaining sufficient health. «Babukhna» from v. Zhytsin Audotstsya Shachok has lived for 86 years and is still well preserved. About forty years ago she became a widow. Being at odds with her daughter-in-law, Audotstsya now lives alone in her old smoky hut, earns her living with work by the day: looking after the cattle, spinning, sewing and cutting with a sickle. She has a good memory, eyesight and hearing, perfectly well narrates about the past, sings and dances. There are a lot of such old grandmas and grandpas among the Sakuns.

One cannot see many of young people, girls and guys, because the Sakuns marry their children very early. A 20-year-old guy and an 18-year-old girl are considered old. So here they are not aware of any merry rounds or careless games or girls' get-togethers.

The Belarusian Sakuns. P. 166–167.

F 46–412

Вуліца ў святочны дзень. Сяло Дражын Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).

A street on a holiday. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

F 46–402

Вуліца ў святочны дзень. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).

A street on a holiday. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

F 46–420

Жанчыны з дзецьмі (Германчукі). Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г.
в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).*

*Women with children (the Hermanchuks). Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).**

Жанчыны носяць упрыгажэнні — на шыі каралі і медальёны, а на руках, на пальцах, «жуковіны», або кольцы. Усе ўзоры на адзенні і палотнах пераважна клятчатыя, а любімыя колеры — жоўты, чырвоны, белы і чорны. Зялёны, сіні і блакітны колеры сустракаюцца рэдка і толькі на новых модных узорах, якімі дзяўчаты і маладзіцы ўпрыгожваюць свае фартухі і полікі на рукавах. Такое пераважанне першых колераў над другімі не дазваляе не зрабіць меркавання, што ў даўніну дрыгавічы маглі ведаць прыгатаванне чырвонай і жоўтай фарбаў з балотнай іржы і цыбульнага шалупіння, а чорнай — з дубовых яблыкаў. Гэтымі фарбамі і па цяперашні час у некаторых месцах фарбуюць велікодныя яйкі і нітки да паясоў і чорных плеценых абор.

Белаарусы-сакуны. С. 164.

The women wear jewelry — beads and medallions around their necks, and on the hands and fingers — «zhukoviny», or rings. All patterns on the clothing and cloth are mainly checkered and the favourite colours are yellow, red, white and black. Green, dark and sky blue are rare and only for new fashion patterns, with which girls and women decorate their aprons and cuffs on the sleeves. This predominance of the first colours over the second ones allows you to think that in the old times the Dregovichs might know how to prepare red and yellow paints from bog rust and onion skins, and black — from oak apples. These colours to the present time in some places have been used to paint Easter eggs and a thread to their waistbands and black wicker dags.

The Belarusian Sakuns. P. 164.

F 46–440

Кірмаш. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).

A fair. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

Адзенне, абутак і галаўныя ўборы сакуноў адрозніваюцца сваёй прастатою, лёгкасцю і практычнасцю. Белая суконная світка, верхняе адзенне зімою і летам, аднаго крою для мужчын і жанчын, — шчыльна абхопліваюць паясніцу і разыходзяцца на бёдрах двума клінамі, у якія ушыты кішэні. Нізкі стаячы «каўнер», правая пала, што захінаецца, і кліны па рубцах абшыты для прыгажосці снурком цёмна-сіняга колеру. На клінах атрымліваецца такім чынам выгляд вусоў. Белую світку «з вусамі» трэба аднесці да самага старажытнага і распаўсюджанага ў Беларусі крою. Зімою дарослыя носяць белыя кажухі такога ж крою, як і світка.

Беларусы-сакуны. С. 163.

Sakun's clothing, footwear and headgear are distinguished by their simplicity, ease and practicality.The white cloth svitka and outerwear in winter and summer of the same cut for men and women, tightly embrace the waist and go apart the hips in two wedges, into which pockets are sewn. Low stand-up «kauner» (collar), right flap that wraps, and wedges on the seams are sewn with a lace of the dark blue colour. A kind of a form of whiskers is obtained on the wedge in this way. The white svitka with «whiskers» must be attributed to the most ancient and widespread cut in Belarus. In winter adults wear white coats of the same cut like the svitka.

The Belarusian Sakuns. P. 163.

F 46-431

Кірмаш. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).

A fair. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

F 46–434

Кірмаш. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).

A fair. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

F 46–428

Кірмаш. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).

A fair. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

F 46–421

Кірмаш. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г. (в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).

A fair. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911. (v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

F 46–399

Кірмаш. Баба з «лясёнкай». Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Дражна, Старадарожскі раён. Мінская вобласць).

A fair. A woman with «lyasyonka» (a mean for carrying). Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

F 46–446

Кірмаш. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць.

A fair. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

F 46–439

Кірмаш. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).

A fair. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

F 46–403

Кірмаш. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць.

A fair. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

F 46–408

Кірмаш. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г. (в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).

A fair. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911. (v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

Экіпажы сакуноў самага прымітыўнага ўстройства. Калёсы — рэдзенькая драбінкі на простых самаробных колах і да таго вузкія, што побач двум седакам на іх усесціся немагчыма. Ездзяць сакуны на сваіх калёсах, як на дрожках, звесіўшы ногі. Але калі сакуну даводзіцца ехаць у суседняе пасяленне ў кумы або ў госці, тады ён ужо зацягвае па баках драбінкі тонкія драніцы ў лазовыя дужкі, перамотвае калёсы спераду і ззаду вяроўкай, садзіцца сам у перадок, а жонку памяшчае ў задок і едзе. Плашкі пад драбінкай на восях называюцца суголаўнямі, а бакавыя брускі драбінкі — бакамі.

Сані — такая ж самая драбінка, але толькі на палазах, без розвальняў. Прытым палазы спераду амаль не загнуты і большаю часткай без ізвін. Аб вазках сакуны не маюць паняцця. Вупраж яшчэ горшая. Просценькі хамут без шляі для каня, ярэмчык для вала і лейцы — вось і ўся збруя. Такія абыякавыя адносіны гаспадарлівага сакуна да экіпажаў і вупражы можна растлумачыць толькі хіба тым, што ён амаль нікуды не выязджае на кані, а працуе пераважна на валах. Конь з'явіўся ў сакуноў, верагодна, не вельмі даўно. Нават у цяперашні час коней у іх вельмі мала — адзін-два на гаспадарку.

Беларусы-сакуны, С. 164.

F 46-411

Кірмаш. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г. (в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).

A fair. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911. (v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

Sakun's carriages are of the most primitive construction». Wheels» (cart) are spaced drabinki small carts with latticed sides) on simple home-made wheels, and so narrow that it is impossible for two riders sit themselves next to each other. The Sakuns ride on their cart, like on droshky (a kind of a light horse-drawn vehicle) with the legs dangling. But if the Sakun has to go to a nearby village to godfathers or to visit somebody, only then he pulls a thin wooden rib on the sides of drabinki into willow bail, twists the cart round with a rope in front and behind, then he sits himself in front and places his wife in the rear part and drives. Logs on the axes under the cart are called «sugolauni» and the side bars of the cart — «bily».

A sleigh is the same cart with latticed sides, but only on sledge runners, without a low wide sledge. At the same time, the front runners are almost not bent and mostly without wire bars. The Sakuns have no idea of a closed sleigh. The harness is still worse. A simple horse's collar without a breast band for the horse, a clamp for an ox and reins — that's the whole harness. Such indifference of a thrifty Sakun to the carriage and harness can only be explained by the fact that he hardly ever goes by horse, and works mainly on the oxen. The Sakuns probably got the horse not very long ago. Even now they have very few horses — one to two per household.

The Belarusian Sakuns. P. 164.

F 46–432

Кірмаш. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г. (в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).

A fair. Village Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911. (v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

Надзвычай маляўнічую групу складаюць часам у святочны дзень каля царквы прадстаўнікі розных абшчын, якія ўваходзяць у склад аднаго прыходу. У такой групе яскрава выдзяляюцца на фоне агульнай масы мясцовыя асаблівасці ў адзенні, якое быццам бы гаворыць само за сябе.

Признаки общинного быта на Полесье. С. V.

F 46–443

Кірмаш. Вёска Дражын Бабруйскага павета. 1911 г.
(в. Дражна, Старадарожскі раён, Мінская вобласць.

A fair. Village of Drazhyn in Babruisk uyezd. 1911.
(v. Drazhna, Staryya Darohi district, Minsk region).

